**Прэс-тур на вёслах . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8**
У адрозненне ад удзельнікаў дзяржаўных прэс-тураў, нас не сустракалі ў кожным населеным пункце дзяўчыны ў нацыянальных строях, да нашага прыезду не мылі асфальт і не фарбавалі вясковыя платы.

**Справа 3485-ці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 2**
Каля трох з паловай тысяч асобнікаў недзяржаўнай газеты «Наша Ніва» не патрапілі ў шапікі «Белсаюздруку».

**5 парад ад лепшых фотажурналістаў Беларусі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 31**
У агенцтве «Рэйтэр», напрыклад, фотакарэспандэнту, які адрэтушаваў свае здымкі ў фоташопе, давядзецца шукаць іншую працу.



а

№ 3 (85) 2010

# абажур

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS




**ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!**

# У дзесятую гадавіну знікнення Зміцера Завадскага калегі-журналісты прыйшлі да пад'езда, з якога тэлерэпарцёр сышоў у невядомасць…







абажур

ГА «БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ»
THE BELARUSIAN ASSOCIATION OF JOURNALISTS

ТРЫМАЙСЯ ПРАЎДЫ!

***Выдавец:*** ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»
***Перыядычнасць:*** 1 раз у 2 месяцы
Выдаецца са снежня 2000 г.
№ 3 (85) 2010 г.

***Галоўны рэдактар***
Уладзімір Барысавіч Дзюба

***Фота***
Photo.bymedia.net

***На вокладцы –***
Святлана Гарда
Фота Аляксандра Зянкова, Дзмітрыя Дзежыца

Выданне зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь, рэгістрацыйны № 833 ад 04.12.2009 г.

Падпісана да друку
Дата выхаду
Фармат 60x84 / 8.
Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк.
Наклад 800 асобнікаў.
Заказ №
Распаўсюджваецца бясплатна.

***Адрас рэдакцыі:***
***220030, г. Мінск,***
***вул. Камсамольская, 7–32.***
***Тэл./факс: (017) 203-63-66,***
***(029) 126-70-98***
***E-mail: abajur@baj.by,***
***baj@baj.by***
***Сайт: www.baj.by***

Друкарня СТАА «МЕДЫСОНТ»
ЛП № 02330/0150444 ад 19.12.2008 г.
Адрас: 220004, г. Мінск, вул. Ціміразева, 9.
Тэл.: (017) 203-74-10, 203-53-41,
(029) 623-74-10
medisont@gmail.com
www.medisont.com

У адпаведнасці з Законам аб друку аўтары нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, прыведзеных у артыкулах.

Рэдакцыя можа публікаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў.

**Справа 3485-ці** . . . . . . . . . . **2**
С. Печанко

**Самарэгуляванне як рэчаіснасць журналістыкі** . . . . . . . . . . **5**
А. Гуляеў

**Прэс-тур на вёслах** . . . . . . . . . . **8**
Я. Мельнікава

**Зямля пад белымі крыламі** . . . . . . . . . . **12**
А. Гатоўчыц

**Паглядзім на дарогу** . . . . . . . . . . **17**
Э. Мельнікаў

**Тры дэтэктыўныя гісторыі ад фрылансера** . . . . . . . . . . **26**
А. Дзянісаў

**Беларускі сатэлітавы** . . . . . . . . . . **29**
Л. Міхейчыкаў

**5 парад ад лепшых фотажурналістаў Беларусі** . . . . . . . . . . **31**
Т. Гусева

**Лекі ад застою мазгоў** . . . . . . . . . . **36**
А. Бяленік

**Вакол «вышкі»** . . . . . . . . . . **39**
А. Лапцёнак, І. Пракопчык

**15 гадоў таму ўпершыню выйшла ў эфір Радыё 101,2** . . . . . . . . . . **42**

**Калі б я магла маліцца** . . . . . . . . . . **48**
В. Равінская

**«Информ-прогулка» без прагулаў** . . . . . . . . . . **52**

**Вось яна якая, жанчына глянца!** . . . . . . . . . . **54**
М. Кастылянчанка

**Два погляды** . . . . . . . . . . **56**
Т. Дземідовіч

**Секс і творчасць** . . . . . . . . . . **59**
Н. Зелянкова

# Справа 3485-ці



*Сямён ПЕЧАНКО*




**Каля трох з паловай тысяч асобнікаў недзяржаўнай газеты «Наша Ніва» не патрапілі ў шапікі «Белсаюздруку».**

**Тэмай «зніклага» № 25 «НН» ад 7 ліпеня быў фільм «Хросны бацька» вытворчасці расійскага тэлеканала НТВ і рэакцыя на яго беларускіх уладаў.**

**Рэдакцыя газеты выказала падазрэнні, што «Белсаюздрук» не пусціў нумар у продаж на загад зверху. Дзяржаўны манапаліст такога не прызнаў, зазначыўшы, што газета пайшла ў продаж і была рэалізаваная ў звычайным парадку. У той жа час Беларуская асацыяцыя журналістаў заявіла пра ўзмацненне цэнзуры.**

### Хронікі знікнення

Супрацоўнікі рэдакцыі «Нашай Нівы» добра ведаюць: чытачы ў газеты пільныя! І не проста пільныя, а звышпільныя, ды яшчэ ў вялікай колькасці. Асабліва яскрава чытацкая пільнасць выяўляецца ў моманты запланаваных нявыхадаў «НН»: колькі ні пішы ў папярэднім нумары пра вымушаны перапынак у працы, а як мінімум дзесятак поўных хвалявання тэлефанаванняў з пытаннямі, што здарылася і чаму няма газеты, нам гарантаваныя. Часцей за ўсё з такімі пытаннямі ў рэдакцыю звяртаюцца сталыя падпісчыкі выдання.

Таму, калі пасля выхаду ў свет 25-га нумара «НН» ад 7 ліпеня ў рэдакцыю пачалі масава звяртацца чытачы, што звычайна набываюць газету ў шапіках, але тут у продажы не знайшлі, адразу пачала расці трывога. Яна толькі ўзмацнілася, калі тэлефанаванні чытачоў працягнуліся і ў наступныя дні. Звычайна ў Мінску газета трапляе ў продаж у сераду па абедзе, у рэгіёнах — у чацвер. А тут хутка пятніца, а «НН» няма не тое што ў Магілёве, — яе ўсё яшчэ не дакупіцца ў сталіцы! І гэта пры тым, што нават у выпадку тэхналагічнага збою газета павінна ісці ў распаўсюд у дзень друку ўсяго на некалькі гадзін пазней.

А ў тую сераду, 7 ліпеня, усё прайшло, як звычайна: макет нумара згодна з графікам трапіў у друкарню, газету надрукавалі. Частка накладу накіравалася ў экспедыцыю «Белпошты», каб у хуткім часе адправіцца па адрасах падпісчыкаў (адзначым, што падпісчыкі той нумар атрымалі своечасова і без аніякіх праблем), а 3485 асобнікаў «НН» адгрузілі на аптовы склад «Белсаюздруку». Яны неўзабаве мусілі з’явіцца ў газетных шапіках па ўсёй краіне, у Мінску ў першую чаргу.

Але хтосьці вырашыў інакш.

Рэдакцыя пачала шукаць праўды. У абед 7 ліпеня ў «Белсаюздруку» на пытанне пра тое, чаму нумар не паступіў у продаж, адказалі: «Нічога не ведаем, на наш аптовы склад газету даставілі». Вечар таго дня пытанні з распаўсюдам праз шапікі не зняў. Супрацоўнікі газеты аб’ехалі кіёскі ў розных раёнах Мінска і сярод іншых выданняў «НН» не пабачылі. Затое

пачулі колькі цікавых адказаў ад прадавачак у газетных шапіках. Так, у Кунцаўшчыне кіяскёрка паведаміла наступнае: «Кіраўніцтва сказала нам, што гэтага нумара не будзе». Тлумачэнне было тым больш дзіўнае, бо прыблізна ў той жа час у аддзеле розьнічных продажаў «Белсаюздруку» нашаніўцам паведамілі, што № 25 паступіў на рэалізацыю.

Гэта была ўся інфармацыя, якую ўдалося атрымаць у сталіцы ў сераду. А ўвечары наступнага дня трывожныя звесткі паліліся з абласных цэнтраў, буйных і малых гарадоў. «НН» з інфармацыяй пра «Хроснага бацьку» не з'явілася ў Брэсце, Віцебску, Гомелі, Барысаве, Белаазерску, Лідзе ды Салігорску. Пры гэтым супрацоўнікі выдання і яго чытачы цікавіліся наяўнасцю газеты найперш у тых шапіках, дзе «НН» прадаецца заўсёды. Цікава, што ў Магілёве ўдалося знайсці № 25 «НН» у адным кіёску, а ў Гродне ў адным месцы паведамілі, што нумар паступіў у продаж і цалкам разышоўся. У астатніх месцах казалі: газета не паступіла, хоць і мусіла.

У сталіцы на след зніклага нумара ўдалося натрапіць толькі ў двух шапіках у раёне Нямігі. Самой газеты журналісты не пабачылі, але пачулі запэўніванні прадавачак у тым, што «нумар паступіў і ўжо прададзены».

Усяго супрацоўнікі газеты праверылі больш за тры дзесяткі кропак продажу. Загадка, чаму ў лічаныя шапікі апальны нумар паступіў, а ў большасць не патрапіў (хоць і развозіцца звычайна адным і тым жа экспедыцыйным аўтамабілем), засталася неразгаданай.

Дадамо, што за час пасля вяртання ў дзяржаўны распаўсюд газета толькі аднойчы спазнялася з траплянням у кіёскі. Было гэта ў абласных цэнтрах, спазненне склала адны суткі. У Мінску выпадкі затрымкі газеты ў найноўшай гісторыі рэдакцыі не зафіксаваныя.

### «Газеты не будзе», але «мы яе прадаём»

Звароты ў рэгіянальныя ўпраўленні «Белсаюздруку» спарадзілі больш пытанняў, чым адказаў. Склалася ўражанне, што калі знікненне часткі накладу і было ініцыяванай зверху акцыяй, то яе непасрэдных выканаўцаў дрэнна падрыхтавалі да непазбежных кантактаў з пакрыўджаным бокам. Мяркуйце самі. Частка абласных арганізацый заняла пазіцыю «газеты не было, ведаць нічога не ведаем». Так, вядучы спецыяліст аддзела перыёдыкі «Мінаблсаюздруку» Алена Церахава, а таксама начальнік аддзела арганізацыі гандлю «Брэстаблсаюздруку» Мікалай Марэйка паведамілі, што на гэтым тыдні (пасля 7 ліпеня) «Наша Ніва» да іх не паступала і ў накладных яе не было. Таваразнаўца «Магілёўаблсаюздруку» Вікторыя Церашкова сказала, што да іх паступілі толькі накладныя на «НН» № 25 ад 7 ліпеня. Што датычыць газеты, то «дырэктар сказаў, што яе не будзе», паведаміла яна.

А вось дырэктар «Віцебскаблсаюздруку» Людміла Южык заявіла, што газета паступіла ў продаж у звычайным рэжыме. Дарма, што жыхары абласнога цэнтра і буйных гарадоў рэгіёна яе так і не пабачылі ў шапіках. Як і жыхары Гомеля. У іхнія б вушы ды словы загадчыцы аддзела розніцы «Гомельаблсаюздруку» Тамары Богусь, якая паведаміла «НН», што газета ў Гомель паступіла і была развезеная па кіёсках. Дырэктар «Гроднааблсаюздруку» Тадэвуш Ваўчкевіч не даў рады разабрацца з праблемай, зазначыўшы, што знаходзіцца ў камандзіроўцы. Але паабяцаў высветліць сітуацыю.

І, нарэшце, супрацоўнік «Нашай Нівы» патрапіў на склад участка газетна-часопіснай экспедыцыі «Белсаюздруку», адкуль газета з друкарні выпраўляецца па краіне. Тут яму паведамілі, што № 25 «НН» быў праведзены па накладных у звычайным парадку і разасланы па сталіцы і рэгіёнах. У падтрымку гэтых словаў супрацоўніку рэдакцыі прадэманстравалі пусты склад.

### «Дзяржава ўпершыню нас датуе»

У сувязі з фактам знікнення часткі накладу рэдакцыя «Нашай Нівы» звярнулася ў Генеральную пракуратуру і Міністэрства інфармацыі. На чарзе магчымы зварот у Гаспадарчы суд. Галоўны рэдактар газеты Андрэй Скурко цвяроза ацэньвае шанцы на аднаўленне справядлівасці, адзначаючы, што давесці факт выкрадання часткі накладу «Белсаюздрукам» з мэтай недапушчэння яго да чытачоў будзе складана. Але пры гэтым, кажа ён, выданне можа сутыкнуцца з першым у сваёй гісторыі фактам дзяржаўнай датацыі. Калі спісанне па выніках ліпеня будзе непрапарцыйна вялікім, гэта будзе значыць, што «Белсаюздрук» неафіцыйна прызнае факт затрымання нумара. Калі ж спісанне будзе звычайным, рэдакцыя павінна будзе атрымаць грошы за нумар, які «паступіў у продаж і быў рэалізаваны».

Пазіцыя рэдакцыі па праблеме была сфармуляваная ў рэдакцыйным каментары. У ім сярод іншага гаворыцца: «Вядома, не чыноўнікі «саюздрукаў» прымалі рашэнне не пускаць у продаж газету з інфармацыяй пра «Хроснага бацьку». Яны былі толькі выканаўцамі. Уражвае інерцыйнасць мыслення работнікаў таямнічага органа, адказнага за забарону. Ужо хто-хто, а чытачы «НН» выдатна разумеюць сутнасць беларуска-расійскага канфлікту апошняга часу і ролю ў ім расійскіх СМІ, якія 15 гадоў маўчалі, а тут раптам загаварылі праўду. Чытач «НН» нічога новага з таго фільма пра Лукашэнку не дазнаўся. Сюжэтам газетнага аналізу быў сам выхад фільма на газпромаўскім канале. № 25 газеты даваў інфармацыю і аналіз падзей мінулага тыдня, як давала б яго любая нармальная газета

ў свабоднай краіне. Канфіскацыя тыражу «НН» стала, апроч іншага, праявай неадэкватнасці рэакцыі аўтарытарнага рэжыму на тыя выклікі, якія перад ім паўстаюць. Беларускае грамадства застаецца пад расійскім інфармацыйным уплывам, які фармуе грамадскую думку па асноўных пытаннях. Эканоміка застаецца залежнаю ад расійскай сыравіны. А лукашэнкаўцы вырашаюць праблемы, затыкаючы рот незалежным беларускім СМІ. Мысленне ў такім ключы робіць дыялог улады з грамадствам немагчымым».

### Вяртанне нічога не гарантуе

Лёсам зніклага накладу актыўна апякуецца Беларуская асацыяцыя журналістаў. Яна разаслала запыты ў абласныя арганізацыі «Белсаюздруку» з просьбай патлумачыць прычыны таго, што нумар газеты не патрапіў у продаж. 20 ліпеня БАЖ атрымала адказ ад дырэктара «Белсаюздруку» Ігара Дудзіча. Ён паведаміў, што «канкрэтныя звесткі аб распаўсюджванні газеты «Наша Ніва» праз гандлёвыя аб’екты РУП «Белсаюздрук», паступленні друкаваных СМІ ў кіёскі прадпрыемства з’яўляюцца інфармацыяй камерцыйнага характару». Пры гэтым чыноўнік дадаў, што наконт рэалізацыі «НН» ад 7 ліпеня праінфармаваў непасрэдна рэдакцыю выдання — прыватнае выдавецкае ўнітарнае прадпрыемства «Суродзічы».

Старшыня БАЖ Жанна Літвіна сітуацыю вакол «НН» назвала «сумнай прыкметай ажыццяўлення цэнзуры ў нашай краіне».

«Тое, што зараз адбываецца, у чарговы раз пацвярджае, што вяртанне дзвюх газет у сістэмы «Белпошта» і «Саюздрук» было палітычным рашэннем. Якое, аднак, яшчэ не гарантуе, што гэтыя выданні будуць пазбаўленыя праблем з распаўсюдам», — зазначыла спадарыня Літвіна.

### Чым не дагадзіў № 25?

Тэмай № 25 «НН» ад 7 ліпеня быў фільм «Хросны бацька», прадэманстраваны на расійскім тэлеканале НТВ, і рэакцыя на яго беларускіх уладаў. У рэдакцыйным артыкуле пад загалоўкам «Хросны бацька капітуляваў» была зробленая выснова, што жорсткі і выкрывальніцкі фільм, аўтары якога вінавацілі Аляксандра Лукашэнку ў непасрэдным дачыненні да знікнення палітычных апанентаў, акурат і мог стаць адной з галоўных прычынаў, што змусіла кіраўніка краіны ратыфікаваць нявыгадны для Беларусі Мытны кодэкс. У тым жа нумары даваўся падрабязны аналіз скандальнай стужкі, пабачыць якую большасць беларусаў, дзякуючы намаганням айчыннай цэнзуры, не змагла. «НН» напісала таксама пра рэакцыю расійскай прэсы на скандал, падрыхтавала агляд найбольш гучных фільмаў і кніг пра Лукашэнку, якія стараннямі спецслужбаў трапляюць да чытачоў і гледачоў крывулястымі сцежкамі. Не абмінула газета і рэакцыю праўладных структур на выпад расійскіх СМІ: у нумары паведамлялася пра акцыю Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі каля Камароўскага рынку — там патрыёты зладзілі перформанс пад назвай «Асцярожна! Смярдзіць КАнаЛ НТВ!».

### «Хроснага бацьку» зняў прафесійны прапагандыст

Што за стужка такая — «Хросны бацька», калі нават згадка пра яе ў малатыражным выданні выклікала такую рэакцыю ў вярхах? Здымаць яе Аляксей Малкоў і Юрый Бабенка прыехалі ў Беларусь у жніўні мінулага года. Пагутарылі з апазіцыйнымі палітыкамі: Аляксандрам Казуліным, Анатолем Лябедзькам, Міколам Статкевічам ды іншымі. У фільме гаворыцца пра зніклых апазіцыйных палітыкаў. Лукашэнка тут адмоўны герой. Зрэшты, як для беларусаў, то нічога новага «Хросны бацька» не расказаў. Яго мэтавай аўдыторыяй хутчэй з’яўляецца расійскі глядач, якога, на меркаванне многіх аналітыкаў па абодва бакі беларуска-расійскай мяжы, рыхтуюць да думкі пра непазбежнасць змены ўлады ў Беларусі.

У часе здымак беларускія спецслужбы затрымалі здымачную групу НТВ і дэпартавалі яе з краіны. Знятыя матэрыялы былі канфіскаваныя. Калі сёлета стужка выйшла ў эфір, яе аўтары паведамілі, што, дзякуючы добрым людзям, здолелі вярнуць забраныя кадры.

Варта дадаць, што расійскія апазіцыйныя дзеячы і журналісты называюць аўтара скандальнай стужкі прафесійным прапагандыстам, які неаднойчы выкарыстоўваўся для дыскрэдытацыі апанентаў расійскай улады і меў за свае заслугі ўзнагароду ад Уладзіміра Пуціна.

Цэнзура на беларускім ТБ толькі падагрэла цікавасць сярод насельніцтва. Як заўсёды ў такіх выпадках, на дапамогу прыйшоў інтэрнэт. Колькасць праглядаў роліка фільма на сервісе You-tube ў першыя дні пасля дэманстрацыі «Хроснага бацькі» на НТВ перасягнула за 120 000. На сайтах, у тым ліку і NN.BY, якія паведамілі пра цэнзуру нашумелага фільма, артыкулы на гэтую тэму выйшлі ў рэкардсмены месяца па прачытаннях.

*Если контроль приходит со стороны, он оказывается еще губительнее, чем отсутствие контроля. Контроль приносит пользу лишь тогда, когда он исходит изнутри.*

*Махатма Ганди*

# Саморегулирование как действительность журналистики



*Анатолий ГУЛЯЕВ*

## Над читателем

…Помнится, мой первый в жизни редактор (очень умный, между прочим, человек!) говорил, вскрывая очередное письмо читателей:

— Всякий, кто жалуется в газету, — слегка или полностью сумасшедший…

И он был прав. За редкими исключениями, в партийную прессу тех времен обращались изобретатели вечного двигателя и борцы с мировым сионизмом. А того, что сегодня называется интерактивностью, в те времена не было и быть в принципе не могло. Поскольку все средства массовой информации стояли не рядом с читателем, а над ним. И были не четвертой властью, а придатком единственной и главной — то есть начальством! А начальству можно только жаловаться! Советоваться с ним или, тем более, советовать ему чаще всего бессмысленно.

Разумеется, не было в те времена и того, что теперь называется саморегулированием. Потому что подмявшие всю власть партийные комитеты были для газеты выше Бога — то есть тем же, чем для «Советской Белоруссии» и прочих изданий из славной когорты «государственных» является сегодня Администрация президента. И мнение читателя (по сравнению с мнением Администрации) не имело и не имеет для этих изданий ровно никакого значения. То есть, **концептуально они застыли на уровне 20–30-х годов минувшего столетия.** И именно поэтому выстраданный журналистикой принцип саморегулирования к ним отношения не имеет. Ну какое, в самом деле, саморегулирование, когда все принципиальные решения принимает Администрация — одновременно Бог Отец, Бог Сын и Бог Дух Святой…

Но весь остальной мир давно изменился и технологически, и мировоззренчески. Причем одно неизбежно было сопряжено с другим. Вспомним: в свое время католическая церковь прокляла печатный станок Гутенберга, который значительно упростил и, главное, удешевил процесс распространения информации, ранее целиком зависевший от держателей дорогостоящего пергамента. А больше информации — прозрачнее жизнь общества. После чего реальным стало еще Платоном сформулированное предостережение: граждане будут получать «*информацию без надлежащих наставлений и, как следствие, сами себя сочтут весьма осведомленными, будучи в основной массе совершенно невежественными*». Что близко к истине, поскольку Платон, как известно, был умный человек. И, между прочим, так оно и получилось: с изменением информационных технологий и со все большей прозрачностью общества менялось мировоззрение…

Хорошо это или плохо, но граждане, получающие информацию «без надлежащих наставлений», в свою очередь стали оказывать все большее влияние на политику и содержание СМИ. Неудивительно: практически все выработанные на планете в последнее время теории СМИ признают зависимость исключительно от читателя (зрителя, слушателя, посетителя интернет-сайтов или как там оно дальше будет называться…). И признают необходимость в связи с этим решать проблемы путем саморегулирования, в интересах читателя и вне сферы государственного влияния. А как иначе-то? Тем более, что читатель (зритель, слушатель…) в состоянии теперь легко создавать собственные — ну, не СМИ, но что-то в этом роде. И отказаться от наших услуг. Что, кстати, все решительнее и делает.

## Семинар

Напомним тем, кто забыл, и сообщим тем, кто не знает: саморегулирование СМИ — *это совместные усилия профессионального сообщества средств массовой информации по добровольному определению принципов, руководящих работой редакции и их соблюдению в открытом процессе информирования общества.* Проще говоря, *журналисты берут на себя ответственность за качественное информирование общества, а с нарушениями готовы бороться собственными средствами.*

Это можно делать разными методами, в разных странах средства свои, и их достаточное количество. Но один из самых важных методов саморегулирования — создание невластного механизма рассмотрения жалоб читателей (зрителей, слушателей…). Он, в первом приближении, создан: в Белорусском союзе журналистов есть Комитет по профессиональной этике, а в Белорусской ассоциации журналистов — Комиссия по этике, которую возглавляет автор. В России существует Большое жюри Союза журналистов. В соседней Литве — Комиссия по этике журналистов и издателей. Там, кстати, есть еще и инспектор по этике…

Тема «регулировочного» семинара особенного энтузиазма у коллег из «государственных» СМИ не вызвала. Коллеги были представлены двумя-тремя журналистками не самых тиражных изданий и председателем Комитета по этике БСЖ Михаилом Шиманским. Кстати, при первом же удобном случае журналистки исчезли. Это логично: трудно заставить человека заниматься тем, что для него не имеет никакого значения. Это почти то же самое, что заставить мою рыжую пушистую кошку есть шампиньоны вместо патентованного сухого корма «Royal Canin».

*Проблемы саморегулирования, профессиональной этики журналистов в изменяющемся медиаландшафте обсуждались недавно на семинаре, который был организован в Минске фондом имени Фридриха Эберта.*

В сложной ситуации оказался и Михаил Шиманский, который с термином «саморегулирование» обращался осторожно, как с новенькой, неизвестно откуда взявшейся вещью с неведомыми качествами. И даже в одном из диалогов выразил сомнение в том, что «это саморегулирование» долго продержится. Спорить сложно, поскольку оно уже «продержалось» и охватило большую часть СМИ планеты.

Сложно спорить и с другим его заявлением: в Комитет по этике БСЖ подается все меньше жалоб, и, возможно, он даже останется без работы. То есть он как бы и не совсем нужен…

Скорее всего, что касается «государственных» изданий, так оно и есть. Воссозданная после советской власти «вертикаль» СМИ, в которой все решается и назначается «вертикалью» власти, уже доказала полную бесполезность на нее жаловаться. В частности, автор, которого несколько раз оболгало белорусское телевидение, столько же раз безуспешно пытался делать это, не получив ни на одно письмо ни одного ответа. При том даже, что при первой попытке разрешения конфликта БТ руководил мой давний знакомый Григорий Кисель, а при второй — еще более давний знакомый Владимир Матвейчук.

Многие из тех, кого перед выборами 2006 года публично обвинили в отправлении естественных надобностей в публичных местах, обращались в органы власти и провластные СМИ с требованием опровержений. С тем же результатом. Примеров множество, и, чтобы перечислять их, не хватит никаких журналов.

В общем, поток жалоб иссякает. Что, тем не менее, парадоксально. Поскольку всякое общество развивается противоречиями. Именно конфликт и возникающие на его основе изменения и дают людям свободу. А бесконфликтное общество — это из области фантастики, причем фантастики ненаучной. Формальное отсутствие конфликтов между СМИ и читателями (слушателями, посетителями сайтов…) — всего лишь свидетельство несвободы общества и недоверия к — в данном случае — «государственным» СМИ. Так было в советские времена, когда на партийные СМИ жаловались лишь все те же изобретатели вечного двигателя и борцы с мировым сионизмом. Автору, поработавшему тогда в том числе заведующим сектором печати, телевидения и радиовещания одного из обкомов партии, приходилось заниматься в основном жалобами определенного типа. Ну, например, «сигналом» о том, что сотрудница одной из районок, которая была интимной подругой всевластного местного редактора, перестала быть его подругой из-за того, что в редакции появилась новая, более привлекательная и, главное, молоденькая сотрудница. Разъяренная журналистка тогда написала жалобу в ЦК партии, в которой обвинила редактора в идеологических провинностях. А потом, когда автор нынешних строк попытался «разрулить» конфликт, в тех же провинностях обвинила уже меня…

## Конфликты

В Белорусской ассоциации журналистов, которая объединяет, в большинстве, коллег из негосударственных СМИ, количество обращений в Комиссию по этике за последний год резко увеличилось. Причем все, без исключения, конфликты в них не личностного, как в упомянутом выше случае, но профессионально-этического характера. Возьму на себя смелость заявить: еще пару лет назад на такие проблемы никто не обратил бы внимания — мало ли что бывает между коллегами…

Но сегодня они стали предметом серьезного общественного разбирательства. Почему?

Думаю, потому что современная «негосударственная» журналистика стремится быть все более нравственной и профессиональной — что, в принципе, одно и то же. Вседозволенность 90-х, равно как и всенедозволенность 2010-х годов, настоящих профессионалов одинаково не удовлетворяют. Кокетничание формулировками вроде «помощники власти», равно как и «вторая древнейшая», становится для них (я имею в виду настоящих профессионалов) оскорбительным. И ситуацию невозможно исправить ни странными призывами говорить правду, что на деле оборачивается недиалектическим собиранием сплошного негатива, ни достаточно бестолковыми умствованиями идеологических отделов власти.



Как следствие, журналистское сообщество считает себя в состоянии разобраться со своими проблемами самостоятельно. Как писал когда-то Томас Джефферсон, «*если бы пришлось выбирать: иметь правительство без газет или газеты без правительства, — я бы, не раздумывая, выбрал второе*». Впрочем, я сильно сомневаюсь насчет «газет без правительства», тем более что в начале 90-х что-то в этом роде уже было. Но уж определить, что хорошо, а что плохо в собственной профессиональной деятельности в рамках даже ныне существующего, нелояльного к СМИ законодательства, профессионалы в состоянии. Если, конечно, никто не будет некомпетентно вмешиваться.

## Уроки

Опыт самостоятельного разрешения конфликтов у Комиссии по этике БАЖ невелик. И, тем не менее, некоторые выводы делать уже можно. Первый из них: Комиссия по этике — это не суд, и она не может (и не стремится!) выносить приговоры в части нравственности или уровня профессионализма того или иного коллеги. Комиссия, согласно положению о ее деятельности, «*осуществляет контроль за соблюдением норм Декларации принципов профессиональной этики, Кодекса журналистской этики Белорусской ассоциации журналистов ее членами при осуществлении ими своих профессиональных обязанностей вне зависимости от времени опубликования данного конкретного материала*».

В положении есть еще целый ряд пунктов, но этот мне представляется наиболее важным. Потому что при рассмотрении того или иного конфликта мы не можем изучить абсолютно все обстоятельства, собрать абсолютно всю информацию. Но зато мы можем с достаточной степенью объективности оценить тот или иной материал или ситуацию с точки зрения соответствия упомянутым выше документам.

Следующий вывод: Комиссия по этике БАЖ в своей деятельности достаточно самостоятельна, тем более что ее избирает съезд и только съезд может прекратить ее деятельность. На наши решения никто не может влиять и, необходимо отметить, никто и не пытается это делать. То есть, с одной стороны, никто не давит — что хорошо. С другой — в трудных случаях не на кого сослаться, что... ну, не то чтобы плохо. Но, скажем так, обременительно. Тезис: «Мы ни при чем, так решила Жанна Литвина!» — не проходит. Нужно брать ответственность на себя.

И последний из этой серии выводов: Комиссия по этике необходима как фактор саморегулирования, поскольку даже наша недолгая практика показывает, что возникающие в рамках профессионального сообщества конфликты (во всяком случае некоторые из них) вполне можно разрешать, не обращаясь в суды.

Повторяю: межличностные конфликты, конфликты «автор — коллектив», «сотрудник — редактор», «редакция — герой публикации» возникают постоянно. Пути для их разрешения в русле саморегулирования при доброжелательном обсуждении находятся почти всегда.

Еще один урок, который можно извлечь из небольшого опыта нашей работы: огромное поле для конфликтов создает некорректное использование информации. Я бы даже высказал прогноз: это в обозримом будущем основной повод для работы комиссий по этике. Как ни печально, воровать информацию в журналистском сообществе в целом «принято».

Следующая проблема — отсутствие аргументации высказанных авторами суждений. Происходит это чаще всего потому, что авторы не могут или не хотят найти информацию, подтверждающую данное суждение. Тем более, что ее иногда не существует вообще. А спрос на смакование гнусностей в обществе есть.

Ситуация эта распространена в белорусской журналистике. Начиная от белорусского телевидения, которое вообще не считает нужным аргументировать свои суждения, сконцентрированные, к примеру, в слове «отморозки». И заканчивая «крутыми» негосударственными изданиями, где авторские суждения не подкрепляются ничем, кроме словесных кружев, сплетенных на скорую руку.



# Прэс-тур на вёслах

Гарачым ліпенем ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» зладзіла прэс-тур у сэрца беларускага Палесся — на Лунінеччыну

*Яніна* МЕЛЬНІКАВА

У адрозненне ад удзельнікаў дзяржаўных прэстураў, нас, незалежных журналістаў, не сустракалі ў кожным населеным пункце дзяўчыны ў нацыянальных строях, да нашага прыезду не мылі асфальт і не фарбавалі вясковыя платы. І ўвогуле да сустрэчы з намі ніхто, акрамя мясцовых сябраў арганізацыі ды гаспадара аграсядзібы «Прыпяцкі плёс», асабліва не рыхтаваўся. Тым больш што мы па «некранутым» Палессі пераважна прайшлі не па зямлі, а па вадзе.

Прэс-тур «Прыпяць — жывая вада Палесся» пачаўся з вёскі Лахаўка, дзе на рэчцы з зусім не паэтычнай назвай Смердзь журналістаў чакалі байдаркі, вёслы і — «на ўсялякі выпадак» — выратавальныя камізэлькі.

І хоць сёння рачулка выглядала досыць ціхай, рызыкаваць мы не сталі і ўсе як адзін апранулі тыя камізэлькі, калі сядалі ў гумавыя «чоўны». Для большасці калегаў такі досвед быў першым, але, падбадзёрваючы адно аднаго, яны адыходзілі ад берага, каб «адмахаць» на байдарках амаль 20 кіламетраў.

Для мясцовых жыхароў рэчкі — тыя ж дарогі. Пакуль мы збіраліся ў сплаў па рэках Палесся, побач кампанія з дзецьмі складала ў сваю «маторку» харчы, каб адпачыць на беразе Прыпяці. Здаецца, што кіраваць лодкаю дзятва тут вучыцца раней, чым хадзіць, а з вудай справіцца кожная дзяўчына.





Першыя ўзмахі вёсламі даліся лёгка. Аднак навуку кіраваць байдаркай даводзілася асвойваць на хаду, таму раз-пораз лодкі заносіла ў берагавы хмызняк. Першая палова вандроўкі праходзіла па невялічкіх рачулках, байдаркі час ад часу туліліся да аднаго з берагоў, калі побач праляталі маторкі. Але хутка мы навучыліся станавіцца носам да хвалі, каб не перакуліцца.

Палову шляху, а гэта дзесяць кіламетраў, давялося ісці па пакручастых, зарослых з абодвух бакоў рачулках і каналах, затое другая палова вандроўкі прайшла па шырокай і глыбокай Прыпяці. Досыць хуткая плынь дапамагала стомленым журналістам. Час ад часу, увогуле кінуўшы веславаць, яны назіралі за палётам шэрых чапляў, буслоў, арланаў, прыслухоўваліся да спеваў птушак у хмызняку, дзівіліся на маляўнічыя краявіды.

Міжволі трохі зайздросцім палешукам, што могуць вось так, «з ветрыкам», прайсці па рацэ дзесяткі кіламетраў. Але ж і мы рухаемся паводле плана: праз паўтары гадзіны махання вёсламі перад намі адкрываецца прыгажуня Прыпяць. Першы прывал...

Тут бы легчы на траўку, з'есці кавалак сала і ні пра што не думаць. Але ж прэс-тур па Палессі — экалагічны. Таму не паспелі журналісты высадзіцца на бераг, як пачалі збіраць у прыбярэжных кустах смецце — пластыкавыя бутэлькі ды бляшанкі з-пад кансерваў. Адным словам, усё, што пакінулі пасля сябе людзі, якія не шануюць родную зямлю. Набраўся не адзін мех. Ужо потым купаліся ў каварнай Прыпяці. Пасля лёгкага перакусу ўсе ізноў паселі ў байдаркі.

Групу журналістаў з Мінска, Гомеля, Лунінца і Барысава ў байдарачным паходзе як інструктар-гід суправаджаў Анатоль Нефідовіч — мясцовы настаўнік, а па сумяшчальніцтве яшчэ і прыватны прадпрымальнік. У Нефідовічаў свой маленькі сямейны бізнес — вясковы турызм. Аднак, калі іншыя прапануюць гасцям лазню, рыбалку і шашлык увечары, Анатоль Нефідовіч прываблівае турыстаў байдарачнымі паходамі і назіраннем за мясцовымі птушкамі. Таму да яго прыязджаюць не толькі турысты з замежжа, але і навукоўцы.





Настаўнік геаграфіі і гісторыі Анатоль Нефідовіч — сябра абласнога савета грамадскага аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Пра птушак Анатоль можа распавядаць гадзінамі. Большасць з іх можа пазнаць на слых. Кожны птушыны голас для арнітолага-аматара мае значэнне, бо дапамагае вызначыць папуляцыю птушак.

Бацька Анатоля Сцяпан Паўлавіч таксама настаўнічаў, зараз усё больш піша пра сваю малую Радзіму, друкуецца ў газеце «Информ-прогулка» (Лунінец). Асабліва краязнаўца ганарыцца сваімі публікацыямі пра мясцовыя рэкі і рачулкі, бо пра кожную, нават тую, якой ужо няма, можа расказаць шмат цікавага.

«Маленькія рэчкі, дзе гарлачыкі і лілеі былі раней, дзе ліны і шчупакі вадзіліся, дзе раней мы карасёў кашамі лавілі, проста зніклі. Асушылі іх зусім, павыпроствалі», — шкадуе аб мінулым Сцяпан Нефідовіч.

«Выпрасталі» меліяратары рэчку Лань (ці Лану, як называюць яе старэйшыя), рэчкі Выдранку і Ваўчанку зрабілі каналамі і прытокамі Смердзі... Разам з рэчкамі «асушылі» меліяратары і вялікую частку жывёльнага і расліннага свету. Калісьці ў гэтых мясцінах, узгадвае Сцяпан Нефідовіч, ракаў лавілі рукамі, уюны вадзіліся, зараз іх амаль не знайсці.







Як сказаў пасля паходу старшыня гомельскай суполкі БАЖ Анатоль Гатоўчыц, такія прэс-туры «вельмі карысныя для журналістаў. Яны даюць магчымасць пабачыць сапраўднае жыццё і набрацца шчырых уражанняў».

***Фота Аляксандра Зянькова***



«Цяпер не тое што ў рэках — на вясковых вулачках жыццё замірае», — шкадуе Сцяпан Паўлавіч.

Вёска Лахва і суседняя Любань — не малыя. Адна толькі Лахва расцягнулася абапал дарогі на 6 кіламетраў. Але ж, калі раней на дзве вёскі прыходзілася ажно чатыры школы, то зараз засталася толькі адна. І ў той — усяго каля 150 вучняў, хаця раней было ў тры разы больш.

«Вымірае вёска пацíху, з'язджае моладзь. Бо не бачыць, чым тут на жыццё зарабляць», — з сумам гаворыць сівы краязнаўца.

Маладыя Нефідовічы больш аптымістычныя. Дзяцей гадуюць «на прыродзе». Разам узяліся за новую справу і арганізавалі аграсядзібу «Прыпяцкі плёс». На заробак настаўніка асабліва не пашыкуеш, таму палацаў у Нефідовічаў пакуль няма. Але гасцінныя суседнія хаты далі прытулак усім журналістам.

Раніцай мы адчулі, як гудзе ўсё цела, як ныюць рукі і пякуць нацёртыя вёсламі мазалі. Але мацней за той боль было пачуццё гонару за самога сябе і сяброў, бо мы гэта зрабілі! Мы прайшлі на вёслах па Палессі! І іншым раім!





# Зямля пад белымі крыламі



З ініцыятывы і намаганняў Лунінецкай філіі БАЖ экалагічны прэс-тур «Прыпяць — жывая вада Палесся» ўдаўся.

Галоўнымі дарадцамі ў гэтай паездцы былі гаспадар аграсядзібы «Прыпяцкі плёс» Анатоль Нефідовіч з вёскі Лахаўка Лунінецкага раёна і ягоны бацька, сябра БАЖ Сцяпан Нефідовіч.

***Анатоль ГАТОЎЧЫЦ***

Нефідовічы сустрэлі журналістаў у вёсцы Лахва — той самай, якая ў XVI–XVIII стагоддзях належала роду Радзівілаў і якой ужо ў наш час захапляўся Уладзімір Караткевіч.



*Сцяпан Нефідовіч*

У Лахве мы перасelі ў байдаркі і веславалі па рацэ са страшнаватай назваю Смердзь ажно да самай Прыпяці — і далей уніз па цячэнні.

Сцяпан Паўлавіч Нефідовіч спярша апавёў нам пра мясцовую царкву. І падалося, што ў гэтым расказе гучала нейкая замова ад самых мудрагелістых нечаканасцяў, якія таіў у сабе наш далёка не просты паход па вадзе. Гэтае адчуванне магічнай абароненасці, што выклікаў мудры вясковы інтэлігент, яшчэ больш узмацнілася, калі Нефідовіч паглыбіўся ў этымалогію назвы «Смердзь». На мапах Рэчы Паспалітай рэчка наогул называлася проста і безапеляцыйна — «Смерць». Хадзіла нават паданне, што іншым разам з яе водаў раздаваўся чалавечы стогн альбо дзіцячы плач. Гэта ў залежнасці ад таго, чыё жыццё мелася забраць рака — дарослага ці малога.

Як бы там ні было, але Лахва і тутэйшая рака Смердзь уразілі ў свой час і Уладзіміра Караткевіча. У нарысе «Зямля пад белымі крыламі» ён пісаў:

*«Рака з непрыгожаю назваю Смердзь ёсць, аднак, адна з найпрыгажэйшых рэчак, якія мне даводзілася бачыць у маім жыцці. Недзе кіламетраў за дзесяць да ўпадзення ў Прыпяць рака пачынае драбіцца на рукавы. Атрымоўваецца некалькі астравоў, злучаных драўлянымі мастамі. На гэтых астравах хаты, што патанаюць у садах. Вада рукавоў цёмна-зялёная, з сонечнымі плямамі, бо над імі вербы ўтвараюць суцэльныя тунэлі. І ў гэтых тунэлях, у імгле, цэлыя чароды чаўноў... І, нібы вакол мала вады, тут яшчэ і шмат сажалак, дзе разводзяць карпаў».*

Старэйшы Нефідовіч, выдатны краязнаўца, нядаўні настаўнік беларускай мовы і літаратуры, не надта пагаджаецца з Караткевічам наконт «астраўнога» жыцця тутэйшых вяскоўцаў, але два масткі, якія аддзяляюць «выспу» ад «выспы»,

паказвае. Ды і самі мы перабіраемся да байдарак праз экзатычны драўляны масток, што выгнуў сваю хісткую спіну па-над Смерддзю. Гэты масток — найкарацейшы шлях з адной вуліцы на другую.

Пакуль мы аглядалі Лахву, Сцяпан Нефідовіч апавёў пра спрадвечных тутэйшых спадарожнікаў чалавека — птушак: «Я калі ў дзяцінстве тут жыў — у суседняй вёсцы Лахаўка, альбо Малая Лахва, — то столькі было птаства: кнігаўкі, кулікі розныя, качкі ўсіх відаў. Насіліся яны хмарамі. Усе балацянкі, выпасы, лугі былі занятыя птаствам. Усё наўкол гаманіла. Цяпер асушылі ўсё, задамбавалі, польдэр зрабілі. Праедзеш кіламетраў дзесяць па гэтых дамбах, добра, калі куліčка ўбачыш, кнігаўку, дзесьці качку».

Але нам шэнціць. Блізу сажалкі мясцовага рыбгасу прыслухоўваемся да гукаў, якія даносяцца з густых зарасляў прыбярэжнага чароту. Нефідовіч пазнае «спевака» — гэта вяртлявая чаротаўка, рэдкая ў Еўропе птушка. Найбольшая папуляцыя яе захавалася менавіта на Палессі.

У жыцці мне даводзілася бачыць нямала настаўнікаў. Былі сярод іх і такія, якіх трапна называлі «прадметнікамі». Такія акуратна выкладалі дзятве ў школе свой «прадмет» і тым былі задаволеныя. Педагагічнаму начальству такія настаўнікі таксама даспадобы — не шукае жураваў у небе, нікуды не ўлазіць, нічога не патрабуе.

Сцяпан Нефідовіч хутчэй «энцыклапедыст», чым звычайны настаўнік, хаця свае прадметы ў яго ў школе таксама былі — родная мова і літаратура. Але ён не замкнуўся, не абмежаваўся адным толькі выкладаннем. Родная мова для яго, як падалося, гэта і наваколле, і гісторыя роднага краю. Гэта ўсё, чым чалавек жыве сёння і чым жыў учора.

Калі ў Лунінцы ўзяліся пісаць гісторыю свайго краю, назваўшы яе «Лунінецкім сшыткам», Сцяпан Нефідовіч узяўся за пяро, каб расказаць, адкуль паходзяць назвы тутэйшых паселішчаў, занатаваць асаблівасці побыту палешукоў. У паэтычнай скарбонцы роднага краю таксама ёсць унёсак Сцяпана Нефідофіча.

Цяпер Нефідовіч-старэйшы задумаў расказаць пра рэчкі, якія былі на тэрыторыі раёна і якія зніклі пасля павальнай меліярацыі: «Ох, рэчак згінула — дзесяткі такіх рачулак. Вось у нас была Каніца — назва ад слова “каня”, кнігаўкі вадзіліся. Альбо, напрыклад, Ваўчанка, Выдранка — іх зрабілі каналамі. Журавінная знікла рэчка — гэта з прыгожымі назвамі. А так — Люта, Марочна. Ёсць Лань, а яшчэ была рэчачка Лана, глухая такая. Свінапаска была маленькая рэчачка, каля Кажан-Гарадка працякала — знікла».

Паводле Нефідовіча, першы ўдар па тутэйшых рэчках нанесла пракладка чыгуначнага палатна. З Грычынскага балота, якое знаходзілася вышэй за Прыпяць, выцякала дзесятак рэчак. Дзе-нідзе будавалі масты, каб даць ход вадзе. Шлях драбнейшым рэчкам проста перагарадзіў чыгуначны

*Анатоль Нефідовіч з жонкай Ірынай і сынам Раманам*



насып. Ну а меліярацыя ўжо не толькі загубіла малыя рачулкі, але і моцна змяніла тутэйшыя абшары: «Цяпер і балота не тое, не тое балота — яно асушана. Няма вады! Там раней і чарвячок нейкі быў, і розныя ракавінкі, і шмат чаго яшчэ. Цяпер усё — сухое балота. У такім балоце ежы няма. Для птушак гэта непрымальны абшар».

Пасля павальнай меліярацыі на Палессі перасталі выкошвацца і паплавы. Яны зараслі кустоўем, высачэзнай асакой. Паступова, заўважае Сцяпан Нефідовіч, мяняюцца і насельнікі тутэйшых абшараў: «Некаторыя віды, якія раней тут не жылі, з'яўляюцца ў гэтых зарасніках. Напрыклад, баклан з'явіўся — непажаданая, агрэсіўная і вельмі пражэрлівая птушка. У вусці Лані ў нас тут заказнік. Раней тут былі цэлыя калоніі шэрых чапляў. Цяпер бакланы ўсё асядлалі. Захапілі іхнія гнёзды, з'ядаюць птушанят. Праўда, з'явіліся ў нас белыя чаплі — вялікія і малыя. Доўгі час іх тут не было, а дзесьці з дзесятак гадоў таму сталі іх заўважаць, прычым шмат. Нашыя мясцовыя птушкі — кнігаўкі, шматлікія кулікі і гэтак далей — паступова знікаюць».

Як чалавек дапытлівага розуму, Нефідовіч звярнуў увагу і на тутэйшыя назвы зёлак і вырашыў напісаць пра адлюстраванне расліннага свету ў народнай культуры Лунінецкага краю: «Тут столькі можна расказаць! Растуць у нас грамічнік, сардэчнік, серпарэзнік — шмат розных назваў, якія гавораць самі за сябе. Напрыклад, белыя суквецці серпарэзніку — а расце ён на балоце — здрабняюць і прыкладаюць да раны, каб гаілася хутчэй. Сардэчнік, альбо, як яго яшчэ называюць, буслоўнік, выкарыстоўваюць пры захворваннях сэрца.

Ёсць багата зёлак, якія выкарыстоўваюць на Купалле — дзеля замоваў, абярэгаў. Тая ж крапіва была сродкам абароны ад знахараў, якія, таго і глядзі, выцягнуць у каровы малако. Кляновыя галінкі засцерагалі хату ад цёмных сілаў. Словам, на кожную лячэбную зёлку і амаль на кожнае значнае дрэва ёсць народнае паданне».

Няўрымслівасць і неспакой, прага да пазнання, жаданне падзяліцца ведамі з тымі, хто вакол цябе, сталі для 70-гадовага вясковага інтэлігента тымі моцнымі крыламі, якія нібы прыўздымаюць яго над родным Палессем. І з вышыні птушынага палёту ён мусіць глядзець на гэты абсяг, асэнсоўваць убачанае і выкладаць на паперу.

Зямных спраў Нефідовіч-старэйшы таксама не цураецца. У мінулым скліканні абіраўся дэпутатам раённага савета. «Паваліў» на выбарах «керасіншчыка» — прадстаўніка паліўна-энергетычнага комплексу.

За час дэпутацтва здолеў дапамагчы шэрагу састарэлых людзей — забяспечыць ім больш высокія пенсіі. З ініцыятывы дэпутата Нефідовіча ў Лахаўцы пачалі парадкаваць вуліцу. Але на



палавіне кінулі — спасылаюцца ўсё на адсутнасць фінансаў.

А яшчэ Сцяпан Нефідовіч вырасціў дваіх сыноў і дачку. І цяпер у яго сем унукаў.

«Я калі думаю пра сваю сям'ю, — кажа Сцяпан Паўлавіч, — то параўноўваю ўсіх з кветкамі. Шаснаццаць кветак — ладны такі букет атрымліваецца».

## «Прыпяцкі плёс»

Малодшы Нефідовіч, Анатоль, таксама педагог. Па першай адукацыі ён настаўнік геаграфіі, па другой — гісторыі. Анатоль — сябра абласной рады ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны», кіраўнік праекта «Захавальнікі тэрыторый, важных для птушак».

Перш чым заняцца экалагічным турызмам, Нефідовіч-малодшы даследаваў сам і разам са школьнікамі ўсе тутэйшыя балацянкі, рэчкі і затокі. І вельмі быў усцешаны, што, нарэшце, тэрыторыя роднай Лунінеччыны ўвайшла ў рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Сярэдняя Прыпяць». Інакш складана было абараняць тутэйшую флору і фаўну: «Тут азначана ў нас, на гэтай тэрыторыі, 182 віды птушак. 150 — гняздуюцца, з іх 52 віды занесены ў Чырвоную кнігу. Калі браць тэрыторыю Беларусі, то найбольш тут сканцэнтраваны так званыя глабальныя віды, якіх у свеце вельмі мала. Так, дзве траціны ўсёй папуляцыі вядомай ужо нам вяртлявай чаротаўкі ў нас знаходзяцца. Альбо вялікі арлец — у нашым Лунінецкім і Столінскім раёнах яго найбольшая

еўрапейская папуляцыя. Белыя сініцы сустракаюцца. Кваква ў вусці Лані гняздуецца. Ну і кулікі, зразумела: кулік-сарока, марадунка, якой у Еўропе амаль не засталося».

Анатоль, як і ягоны бацька, засмучаны найбольш тым, што ўсё гэтае багацце мала знаёмае не толькі дзятве, але і школьным выкладчыкам: «Засмучае наш адукацыйны падыход. Людзі нават з вышэйшай адукацыяй, не кажучы пра школьнікаў, не ведаюць самага простага, звычайнага ў свеце птушак і раслін. Калі пералічваць віды, якія ведаюць нават біёлагі, хопіць пальцаў на руках. А ў прыродзе — зрокава, на слых — яны вызначаць яшчэ меней. А калі мы не ведаем, то мы не імкнемся гэта захаваць, не беражом, не цэнім».

Летась Анатоль Нефідовіч зарэгістраваў сваю аграсядзібу «Прыпяцкі плёс». Адважыўся на такі крок, бо адчуў, што дзяржава спрыяе развіццю сельскага турызму.

Жонка Ірына, настаўніца геаграфіі, таксама была не супраць і нават падтрымала мужа. Сапраўдныя географы — гэта не дамаседы, гэта — падарожнікі. Анатоль, што называецца, аб'ездзіў Беларусь, быў на Байкале, у Алтайскім краі, у гарах Цянь-Шаня. Апошнія гады ў Карпаты ледзь не кожную зіму ездзіць. На першыя свае настаўніцкія адпускныя Анатоль купіў трохмесную байдарку. З Ірынай і старэйшым сынам Раманам не раз падарожнічалі па беларускіх рэках.

*Буслы ў Кажан-Гарадку*



Каму ж у такім разе займацца агратурызмам, як не Анатолю, абазнанаму ў гэтай справе чалавеку?!

— Агратурызм, — лічыць Анатоль, — дае магчымасць знаёміць людзей з прыродай нашага краю, з яго флорай і фаўнай.

Ірына, у сваю чаргу, заўважае, што аграсядзіба спрыяе новым знаёмствам.

Сітуацыя захапіла нават сына Рамана, і ён захвоціўся паступаць на біялагічны факультэт у БДУ. Узорная атрымаецца аграсядзіба — тут свае географ, гісторык, біёлаг, літаратар.

12:10 — Як толькі мы накіраваліся да турнікета, каб выйсці, перад намі як з-пад зямлі вырас цёмнавалосы мужчына. «Ахмедаў, намеснік дырэктара па рэжыме», — сціпла прадставіўся ён і запрасіў да сябе ў кабінет. У кабінеце ён адразу тонам, які выключае спрэчкі, запатрабаваў у нас паперу на акрэдытацыю і тлумачэнні, навошта мы знаходзімся на тэрыторыі завода. Тое, што мы атрымалі дазвол ад дырэктара, здымалі ў прысутнасці прадстаўнікоў адміністрацыі, ніяк не паўплывала на спадара Ахмедава. Ён выклікаў міліцыю, якая з'явілася даволі хутка. Усё скончылася высвятленнем нашых асобаў, складаннем тлумачальных, апісаннем апаратуры ды канфіскацыяй відэакасеты. На ўсе нашы заявы наконт правоў журналістаў і спасылкі на Канстытуцыю адказ быў кароткі: «Там разберутся!»

Прыкладна праз дзве гадзіны нас адпусцілі. Непадалёк ад прахадной нас сустрэлі некалькі маладых рабочых. Смяюцца, паціскаюць рукі. Адчуваем сябе няёмка: яны чакалі на вуліцы, а надвор'е студзёнае...

Аднак можна лічыць, што мы прыехалі не дарма. Мы тут былі патрэбныя. Пасля размовы з рабочымі стала зразумела, чаму так нерваваўся спадар Ахмедаў і чаму прыехала міліцыя. Праблемы прадпрыемства не павінны былі прасачыцца праз агароджу «Нёмана». Толькі мы пра іх усё адно расказалі.

Пасля ўсяго ў душы з'явілася прыкрая супярэчнасць: калі ты не адчуваеш сябе злачынцам, а цябе ў нечым падазраюць.

Прыкладна праз паўтара месяца мы атрымалі позвы ў пракуратуру Гродзенскай вобласці, дзе шчуплы пракурор радасна ўручыў нам папярэджанне за правядзенне відэаздымкаў без акрэдытацыі.



# Гісторыя другая,

## ці Як атрымаць штраф за самаўпраўства (студзень 2010 г.)

**12:00** — Сёння я, як ніколі, спакойны. Едзем здымаць сюжэт на звычайную культурніцкую тэму. У друкарні гарадзенскага ўніверсітэта выдалі падручнік «Гродназнаўства», які даўно чакалі. Цяпер большасць школьнікаў ведае, хто такія Сувораў ды Ленін. Аднак у іх вельмі цьмяныя ўяўленні пра Антонія Тызенгаўза ды Давыда Гарадзенскага. Да сённяшняга дня мы знялі багаты матэрыял: сустрэліся з гродзенскімі гісторыкамі і краязнаўцамі, складальнікамі падручніка. Працы засталося небагата.

У горадзе ўсяго дзве школы, дзе факультатыўна пачалі выкладаць курс гродназнаўства. Адна з іх — СШ № 28. Напярэдадні я паразмаўляў з настаўнікам гісторыі Аляксандрам Рабковым, а журналіст Аляксандр Хілімон — з дырэктарам школы Ігарам Ахметавым: мы растлумачылі, што здымаем невялікі дакументальны фільм пра гродназнаўства.

**12:40** — Каля школы адзінока сумуе міліцэйскі «варанок». Жартую: «Можа, за намі?» Сябра смяецца. На ўваходзе нас сустрэў спадар Рабкоў і праводзіў да дырэктара. Невялічкага росту вусаты чалавечак з чырвоным тварам павітаў нас і папрасіў прысесці. Пачалася доўгая размова пра тое, навошта нам спатрэбіліся гэтыя здымкі. Узнікла нейкая незразумелая напружанасць.

**13:55** — Пасля доўгай размовы з дырэктарам Ахметавым мы запісалі на камеру завуча школы, а потым — настаўніка гісторыі Рабкова, якія распавялі пра курс гродназнаўства. Знялі вельмі ўтульны і стылёва аформлены клас і сталі чакаць, калі пачнецца ўрок.

На калідоры чуваць крыкі малых, якія выхваляюцца перад вучнямі іншых класаў: «А нас на уроке будут снимать на видеокамеру!»

**14:00** — Пасля званка ў клас шумна заходзяць дзеткі. Сядаюць. Пачынаецца ўрок.

**14:01** — Дзверы рэзка адчыняюцца, і на ўваходзе з'яўляецца мужчына ў цывільным. З-за яго спіны выглядае яшчэ адзін. «На выхад з рэчамі! Вы! І вы, з камерай, таксама!» — амаль што крычыць, па ўсім відаць, ахоўнік правапарадку. Нямая сцэна ў стылі Гогаля: здзіўленне і трывога на твары немаладога настаўніка, спалоханыя дзеткі — такіх велізарных вачэй я даўно не бачыў.

**14:02** — Выходзім. За плячыма міліцыянтаў амаль што не плача завуч школы. Дырэктар мітусіцца і шэпча мне на вуха: «Я нічога не разумею! Што здарылася? Што тут робіць міліцыя?» Яго і без таго чырвоны твар стаў амаль што фіялетавым. Міліцыянты нічога не тлумачаць і вядуць нас у настаўніцкую. На тварах таксама няўпэўненасць: што з намі рабіць?

14:15 — Праз пятнаццаць хвілін прыязджаюць двое міліцыянтаў пры пагонах. А вось гэтыя, пранеслася думка, добра ведаюць, што з намі рабіць. І сапраўды — адразу задаюць пытанне пра акрэдытацыю. А яшчэ міліцыянт, які запісваў мае тлумачэнні, быццам між іншым двойчы ўзгадваў пра тое, што ў мяне ўжо ёсць пракурорскае папярэджанне. Цікавая дасведчанасць...

---

*P. S. Праз некаторы час на мяне завялі адміністрацыйную справу. Спачатку «кампрамат» на мяне «лётаў» паміж міліцыяй і пракуратурай, а потым, калі патрапіў у Міністэрства інфармацыі, паперы зноў накіравалі ў гродзенскую міліцыю. Як высветлілася, міністэрства не выносіць папярэджанняў фізічным асобам, і тут узнікае вельмі цікавая «адміністратыўка» з фармулёўкай «самаўпраўства». Маёй «справай» займаўся звычайны ўчастковы, які спачатку таксама не ведаў, што са мной рабіць. Здаецца, малады хлопец, які яшчэ не страціў сумлення, шчыра спрабаваў ва ўсім разабрацца. Потым, мяркую, яму падказалі ці загадалі. І ён хутка ўсё аформіў. Як — не вельмі істотна. Галоўнае ў тым, што Сістэма заўсёды знойдзе патрэбную ёй фармулёўку.*

*Квінтэсенцыяй усёй гэтай гісторыі было іншае: для мяне ўвесь час заставалася загадкай, хто і навошта выклікаў міліцыю. Праз некаторы час, калі нас выклікалі ў суд, дырэктар Ігар Ахметаў расказаў, што міліцыю выклікаў ён. І патлумачыў гэта тым, што мы падаліся яму надта падазронымі. На пытанне суддзі, што падазронага было ў нашых паводзінах ці выглядзе, спадар Ахметаў так нічога і не адказаў. Не ведаю, што з'явілася сапраўднай прычынай «наезду» міліцыянтаў, але спадару Ахметаву ў любым выпадку выпала вельмі незайздросная роля. Аднак кожны ў жыцці выбірае тое, што выбірае...*

## Гісторыя трэцяя,
### ці Як патрапіць у дэтэктыў (люты 2010 г.)

09:00 — Збіраюся, як на вайну. Сёння тэлекамера — мая зброя. Сябры непрызнанага ўладамі Саюза палякаў Беларусі ладзяць малебен ля ганку Кастрычніцкага РАУС, дзе ў СІЗА адбываюць «суткі» трое актывістаў СПБ: Андрэй Пачобут, Мечыслаў Яскевіч ды Ігар Банцэр. Акцыя зусім мірная: збяруцца людзі і разам з ксяндзом памоляцца. Але прадстаўнікоў сілавых структур сённяшняй Беларусі навучылі бачыць літаральна ва ўсім схаваную пагрозу. Таму кожную хвіліну можна чакаць і разгону, і затрыманняў. Асабліва дзяржаўных «праваабаронцаў» раздражняюць незалежныя журналісты з фота- і тэлекамерамі ў руках.



09:30 — Мяне падвозіць сябра на машыне. Прыпаркаваліся так, каб аўто не было бачна. Сябра застаецца чакаць. Выходжу — і мяне адразу ахутвае студзёны, марозны подых. Рэкагнасцыроўка на мясцовасці: насупраць будынка РАУС, праз вуліцу, — інтэрнат. Зручнае месца, дзе можна схавацца са сваёй «відэазброяй». Раблю выгляд, што шукаю знаёмага, і праходжу ў будынак, падымаюся на некалькі паверхаў.

10:00 — Пачалася акцыя. Сабраўся натоўп людзей. На прыступках пастарунка — міліцыянты. Здымаю некалькі планаў, але гэтага мала. Трэба спускацца да месца падзеі.

10:10 — Нацягваю на галаву капюшон, на твар — «палесцінку», пакінуўшы толькі шчыліны для вачэй. Рукі пацеюць, крыху хвалююся. Здымаю некалькі планаў. Міліцыянт на ганку здымае мяне, а я — яго. Твар у твар, аб'ектыў у аб'ектыў. Як два снайперы. Трэба зрабіць пару планаў з боку міліцыянтаў. Праз колькі секунд мяне хапае за руку мажны чын пры пагонах: «Вы почему тут снимаете? Пройдемте!» Я вырываюся: «Не жадаю!» Хутка прасоўваюся паміж людзьмі ў бок пешаходнага пераходу. Пагоні не адчуваю. Штосьці яны не аператыўна працуюць... Вось і будынак інтэрната. За ім — аўтамабіль. Вельмі хутка бягу. Бакавым зрокам заўважаю, як за мной імчыць мянтоўская «ГАЗель». Нейкі дэтэктыў з элементамі баевіка — дый толькі. Паспяваю кінуць тэлекамеру сябру і крычу, каб ён хутчэй з'язджаў, а сам бягу далей. Праз пару хвілін я ўжо стаю з заламанымі за спіну рукамі, мяне абшукваюць два супрацоўнікі міліцыі. Садзяць у «халодную», што ззаду «ментамабіля». Пытаюцца: «Дзе камера?» «Не ведаю», — адказваю. Бачу, як людзі-«паляўнічыя» нервуюцца.

10:30 — У машыне мяне пратрымалі каля 15 хвілін. Чакалі, пакуль удзельнікі акцыі разыдуцца. Звоніць мой мабільнік, загадалі выключыць. Па рацыі загад: «Вязіце!» У міліцэйскім пастарунку чую размову:

— Дзе яго камера?

— Няма...

— Ну ідзіце, разбірайцеся!

Разумею, што ім няма чаго мне прад’явіць. Што рабіць далей? Адмаўляцца ад допыту? Патрабаваць адваката? Неяк сама сабой прыйшла думка: а што, калі «папрыколвацца»? Разыграю поўнага дурня…

10:50 — Прымушаюць складаць тлумачальную. У адказ на пытанні пачынаю несці поўную лухту:

— Што ты здымаў?

— Адкуль вы ведаеце, што я здымаў? Можа, тэлекамера была выключана?

— Не круці тут з намі. Адкуль у цябе камера?

— Даў адзін чалавек. Ведаю яго толькі візуальна. Кантактаў не маю.

— Назаві ягоныя прыкметы.

Чамусьці пачынаю апісваць Зянона Пазьняка. Размова працягваецца:

— Мы ўсё ведаем. Ты за грошы здымаў тут! Куды падзеў камеру?

— Перадаў візуальна знаёмаму каля інтэрната…

Ну і гэтак далей.

Праз хвілін дваццаць мяне адпусцілі. Калі ішоў да прыпынку грамадскага транспарту, заўважыў, што «дэтэктыў» працягваецца. За мной ехаў белы аўтамабіль. Яны, мабыць, сачылі, калі я сустрэнуся з тым «візуальна знаёмым», каб забраць тэлекамеру. Вылічыць сачэнне на маленькай вуліцы аказалася проста. Я зайшоў у краму, потым надоўга прыпыніўся ля газетнага шапіка. Аўтамабіль паслухмяна чакаў. Страцілі яны мяне, мабыць, толькі калі я перасеў у трэці па ліку тралейбус. Потым яшчэ гадзіну я швэндаўся па цэнтры Гародні. Хутка ўзяў сябе ў рукі. Пад вечар сустрэўся з сябрам і забраў апаратуру.

---

*P. S. Шчыра кажучы, ніколі не любіў дэтэктывы. Чытаў неяк падлеткам, але гэта хутка прайшло. На жаль, журналісцкая справа прымусіла мяне, маладога законапаслухмянага грамадзяніна, стаць часткай нейкага брыдкага дэтэктыва. Яго сутнасць скіравана на цкаванне вольнага слова, на пазбаўленне маіх суайчыннікаў права атрымліваць усебаковую і праўдзівую інфармацыю. Усё гэта — Сістэма, дзеянні якой у дачыненні да незалежных журналістаў цалкам супярэчаць Канстытуцыі маёй краіны — сінявокай, шчыра любімай, але надта памяркоўнай і цярплівай Беларусі.*




# Белорусский сателлитовый

## Потенциально Белсат может удвоить свою аудиторию



*Леонид* **МИХЕЙЧИКОВ**

Ни одно средство массовой информации нынче не может сравниться с телевидением. Да, у других СМИ — радио, газет — свои позитивные качества, но ТВ отличается завидной массовостью и устойчивостью ежедневной аудитории. Практически все взрослое население (96–98%) Республики Беларусь смотрит программы и передачи функционирующих на территории страны телевизионных каналов.

Благо, расширяются и возможности: обычное эфирное телевидение теснится кабельным, спутниковое дополняется просмотром телепередач по интернету. Технологии развиваются стремительно: огромные спутниковые «тарелки» сменяются компактными «блюдцами», комплектация на один спутник уступает место «наводке» на два-три-четыре спутника. Появляются мультифокусные спутниковые антенны.

Через спутники, интернет телезритель Беларуси может получать продукцию станций и каналов, находящихся далеко за пределами родины. На такое «проникновение» рассчитан и Белорусский сателлитовый (Белсат). Созданный более двух лет назад на территории Польши, Белсат специализируется на передаче разнообразной информации (общественно-политической, новостной, образовательной, развлекательной и т. д.) для белорусского телезрителя.

Насколько этот телевизионный аналог «Радио Свобода» известен и востребован в Беларуси, каково общее отношение к Белсату?

В ходе общенационального зондажа общественного мнения граждан Беларуси (апрель 2010 года)* сотрудники социологического

---

** **Примечание**. Социологическое исследование проведено с 5 по 15 апреля 2010 года. Метод опроса — интервьюирование-анкетирование жителей Республики Беларусь 18 лет и старше. По пропорционально-квотной выборке опрошено около полутора тысяч (1 503) респондентов. Контролируемые параметры: тип населенного пункта, пол, возраст, образование. Ошибка репрезентативности не превышает 1,5%.*




*Рис. 1 Отношение телезрителей Беларуси к программам канала Белсат (в %)*

центра ООО «Зеркало-Инфо» предложили телезрителям страны вопрос: **«Вы смотрите программы телевизионного канала Белсат?»** (рис. 1).

Выяснилось: каждый десятый телезритель страны (10%) лично знаком с продукцией спутникового канала Белсат. При этом 2% являются его постоянными поклонниками, а 8% респондентов «несколько раз смотрели этот канал». Среди зрителей телеканала Белсат преобладают мужчины, люди в возрасте 18–49 лет, лица с высшим и средним, средним специальным образованием.



По роду занятий это рабочие и студенты, предприниматели и ИТР, работники сферы обслуживания, торговли и представители творческих профессий. Около трети — 30% зрителей Белсата — проживает на селе.

Кроме 10% зрителей Белорусский сателлитовый располагает достаточно представительной потенциальной телеаудиторией. По сути, столько же — 10% телезрителей страны — настроены на просмотры передач спутникового канала Белсат. Из них 9% хотят просматривать программы этого телеканала, но «не имеют возможности». А 1% респондентов планируют начать просмотр этих передач. Среди не имеющих возможности смотреть программы канала Белсат преобладают мужчины. Более двух третей — это лица в возрасте 18–24 лет, 40–49 лет и старше 60 лет. Три четверти — люди со средним образованием. И каждый второй — рабочий и пенсионер. То есть при определенных объективно-субъективных условиях аудитория Белсата может удвоиться и возрасти до 20%.

Еще столько же — 19% респондентов, отвечая на предложенный вопрос, указали, что знают о существовании такого канала, как Белсат, но не смотрели его передачи.

Можно предположить, что аудитория Белорусского сателлитового была бы гораздо шире, если бы информированность граждан страны о Белсате была более полной. Практически каждый второй респондент (47%) впервые услышал о таком телеканале лишь в ходе социологического исследования от анкетеров-интервьюеров. Среди телезрителей, не осведомленных о существовании Белсата, преобладают женщины. Около половины — лица в возрасте 50 лет и старше. И каждый второй — пенсионер и рабочий.

И, как всегда, среди телезрителей страны имеется слой «консерваторов». 11% респондентов однозначно указали: «Не смотрю Белсат, мне неинтересно». Среди них заметно преобладают женщины, зрители со средним или средним специальным образованием. В профессиональном плане несколько превалируют рабочие, госслужащие, работники сферы обслуживания и торговли, домохозяйки.

# 5 советов от лучших фотожурналистов Беларуси

Ценный совет о том, как снимать для газеты, я получила на первом курсе журфака от преподавателя, который был грозой факультета. Говорили, что студенты-«очники» сдавали ему зачет по фотожурналистике с 15-го (!) раза. Нам, заочникам, повезло: удачливые сдавали фотодело с третьей попытки. Главное правило от завкафедрой Владимира Ладутько звучало так: «Прежде чем нажать кнопку, подумай, что ты хочешь сказать этим снимком».

Нашим собеседникам — победителям первого в Беларуси конкурса пресс-фотографии — есть что сказать и читателям, и коллегам. Лауреаты «Пресс-фото Беларуси 2010» поделились с «Абажуром» знанием о том, каким должен быть хороший снимок для печатных и онлайновых изданий, и дали советы тем, кто делает свои первые шаги в фотожурналистике.



*Татьяна ГУСЕВА*

## 1. Будь честным

Александр Саенко, фотокорреспондент газеты «Вечерний Гродно», занял первое место в номинации «Природа» и третье в номинации «Искусство и развлечения». Саша — один из самых молодых лауреатов конкурса. Ему 24, и фотожурналистикой он занимается несколько лет.

Карпов в рыболовных сетях Саша сфотографировал в деревне Солы на Гродненщине. «Осенью там вылавливали рыбу и осушали озеро. Мне дали химзащитный костюм, и я пошел в воду». Саша вспоминает, как хороший снимок едва не стоил ему жизни: «Глубина была по шею, дно илистое, и я почувствовал, что меня засасывает… Еле выбрался».

По мнению Александра Саенко, пресс-фотография прежде всего должна быть честной, не постановочной: «Ты показываешь людям картинку с места событий, и задача фотографа — найти самое главное, то, что характеризует это событие».

Саша с удовольствием участвует в документальных проектах. В течение года он снимал, как кормят бомжей в Бригитском монастыре. «Сначала они неохотно шли на контакт, а когда я стал приходить туда часто, они поняли, что я не залетный и меня волнуют их проблемы, привыкли видеть меня рядом», — говорит фотограф.

## 2. Люби людей и уважай коллег

Обладателя Гран-при Виктора Драчева, фотокорреспондента агентства «Франс Пресс», на форуме фотопортала ZHЯТА и в блогах ЖЖ упрекали: снимки из серии «Чернобыльская зона. 20 лет спустя» — постановочные. Поводом для дискуссии послужил материал Василия Семашко «Пресс-фото 2010» — или пресс-постановка?».

«Снимок, получивший Гран-при, сделан в деревне Тульговичи Хойникского района Гомельской области в апреле 2006 года. Это единственная деревня в Беларуси, окруженная зоной отселения, но не относящаяся к ней. В Тульговичах в 2006 году проживало 8 человек. Всем этим людям больше 50 лет. Деревня была отселена в 1991 году, и тогда эти люди просто отказались покидать родные места… — пишет Василий Семашко. — Тогда, на 20-летие Чернобыльской катастрофы, снимки подобной тематики были очень востребованы, и в тех краях наблюдалось настоящее нашествие журналистов, снимающих жителей Тульгович. Но Виктору Драчеву захотелось снять их так, как никто другой. С этой целью он сам и организовал в Тульговичах «праздник». Как опытный постановщик, попросил вытащить из дома стол, разместить его на пустыре

под открытым небом так, чтобы за столом были видны покинутые дома. За столом, на котором виднеются привезенная с собой водка и местные соленья, разместил массовку из местных жителей… «Праздник» под названием «Приехал фотограф» удался. Снимки получились не хуже тех, что снимают в павильонах «Беларусьфильма». Жители Тульгович с работниками заповедника еще долго будут вспоминать этот «праздник».

После такой публикации особо эмоциональные участники «Пресс-фото» призывали пересмотреть результаты конкурса. Но жюри единодушно сошлось во мнении, что результаты должны остаться прежними. «Фотограф может спровоцировать ту или иную ситуацию и принять в ней участие, — заявили судьи. — «Пресс-фото Беларуси» не является конкурсом документальной фотографии. В том же конкурсе World Press Photo не раз побеждали постановочные, а не репортажные снимки».

Виктор Драчев считает, что статья Семашко сделала ему дополнительную рекламу. «Постановка заключалась в том, что на Благовещенье я привез жителям деревни две бутылки водки и закуску, — говорит он. — Я знал, что все равно люди позовут за стол, поэтому и приехал не с пустыми руками. Инсценировки застолья я не устраивал, люди сами собрались к приезду гостей».

По мнению Виктора Драчева, в работе фотокора есть ситуации, когда нужно продумывать все детали. «Когда едешь в захолустье, нет смысла снимать покосившиеся заборы или обшарпанный клуб, ведь такие же разрушенные деревни есть и под Минском».

Советы от Виктора Драчева начинающим фотографам:

— смотреть хорошие фотографии в интернете и в газетах;

— уважительно относиться к коллегам на съемке: не толкаться, не материться и стараться не мешать снимать другим. «Иногда бывает, я снимаю, а за моей спиной встает человек пять. Коллеги могли бы поискать другие место и ракурс, а не повторять за мной»;

— нельзя работать в фотожурналистике, если ты не любишь людей. «Мне один фотограф сказал, что принципиально не ходит снимать спецназ, потому что ненавидит всех, кто там работает. А мое мнение — не вина спецназовцев в том, что они воспитаны в других традициях. Если ты не уважаешь людей — ты не журналист».

## 3. Смотри, как снимают в мире

Работы фотокорреспондента газеты «Наша Ніва» Юлии Дорошкевич победили в номинациях «Люди в новостях» и «Спорт». Фоторепортер оппозиционных выступлений и акций в Беларуси последних лет знает, как сделать хорошую картинку с хорошими эмоциями. «Мне бы хотелось, чтобы белорусская пресс-фотография соответствовала мировому уровню, — говорит Юля. — К сожалению, пока не было случаев, чтобы наши фотографы побеждали в конкурсе World Press Photo. Участвуют в нем единицы, но никогда ничего не занимают. Я хочу видеть белорусскую фотожурналистику в мировом контексте, чтобы коллеги ставили перед собой планку, к которой нужно стремиться, чтобы у них появились азарт и дух состязательности».

По мнению Юлии Дорошкевич, для начинающего фотографа важно не вариться в собственном соку (читай: в редакции), а смотреть, как снимают в мире. «Один профессиональный фотожурналист дал мне совет: забудь про все блоги и белорусские сайты, смотри фото на yahoo.com, daylife.com, http://www.magnumphotos.com, «Рейтер», «Франс Пресс». На этих сайтах можно специально выбрать снимки, которые сделаны в Беларуси».

Юле по душе снимать события, где чувствуешь атмосферу, которую можно передать. Драйв можно испытать, и слушая песни деревенских бабушек, и на футболе. Юля вспоминает, как однажды снимала на Октябрьской площади, где транслировался матч Испания — Россия. «Испанцев было мало, но они были колоритные, разукрашенные. А когда игра закончилась победой российской команды, началась драка. Над моей головой свистели… бутылки. Милиции было очень мало, и я была словно между двух огней. По эмоциональной напряженности та съемка была особенная».

## 4. Всегда бери с собой фотоаппарат

Наталья Абложей, фотокорреспондент информагентства БелТА, профессионально занимается фотографией три года. Снимки Натальи победили в номинациях «Люди в новостях», «Повседневная жизнь» и «Искусство и развлечения». На съемки марш-броска в Борисовском районе Наталья забыла взять длиннофокусный объектив, поэтому работать пришлось с широкоугольником. «Чтобы сделать крупные планы, мне приходилось идти в воду вместе с участниками события, — вспоминает фотограф. — Поэтому получились удачные снимки».

Наталья взяла себе за правило всегда брать с собой камеру. «Хотя признаюсь честно: только однажды я взяла ее не зря. По дороге в магазин увидела, как солдат несет картину около Национального художественного музея». Именно этот снимок и занял второе место в номинации «Искусство и развлечения».

«Когда ты идешь на съемку, стоит подумать, что ты хочешь снять, — делится опытом



3-е место в номинации «Гламур»,
автор Сергей Гриц.
Белоруска Татьяна Литвинчук
со своей кошкой во время
международной кошачьей
выставки.
Минск, 24 мая 2008 года



3-е место в номинации «Новости»,
автор Дмитрий Брушко.
Очередной экзамен для
военнослужащих, стремящихся
получить краповый берет.
24 октября 2007 года





*2-е место в номинации «Искусство и развлечения», автор Наталья Абложей. Солдат несет картину около Национального художественного музея*





*1-е место в номинации «Новости», автор Василий Федосенко. Серия «Массовые протесты после президентских выборов 2006 года». Белорусский ОМОН готовится встретить участников оппозиционного шествия. Минск, 25 марта 2006 года*

Наталья. — Это как в магазин за продуктами идти — лучше заранее составить список, чтобы не потратиться на ненужное. Молодым фоторепортерам полезно опираться на опыт коллег, но в то же время не стоит стараться снимать так, как они. Думай, что ты хочешь сказать своим снимком».

Для души Наталья Абложей любит снимать футбол и сельскую жизнь. «Как бабушки жнут — это очень красивый ритуал. Как кабана колют, как готовятся к Рождеству. Я сама выросла в деревне и видела картинки из сельского быта каждый день».

## 5. Забудь о фотошопе и учи английский

Серии «Массовые протесты после президентских выборов 2006 года» жюри конкурса присудило первое место в номинации «Новости». Автор работ — Василий Федосенко — начинал карьеру в городской газете «Бабруйскае жыццё». Потом был фотокором газет «Знамя юности» и «Советская Белоруссия». В настоящее время — штатный фотограф агентства «Рейтер».

«Пресс-фотография в первую очередь должна быть объективной — нравится это кому-то или нет, — считает Василий Федосенко. — В мировых агентствах и уважающих себя изданиях сейчас строго следят за тем, чтобы фото было честным, не искажало действительность, т. е. не подвергалось технической обработке. В агентстве «Рейтер», например, фотокорреспонденту, отретушировавшему свои снимки в фотошопе, придется искать другую работу».

По мнению Василия, функция пресс-фотографа — следить за событиями в своем регионе, держать руку на пульсе, максимально оперативно реагировать на то, что происходит. Многое зависит и от везения — оказаться в нужное время в нужном месте, занять удобную позицию для съемки.

«Когда идешь на съемку — никогда не знаешь, что тебя ждет. Бывает, скучное, на первый взгляд, мероприятие может подарить шикарные кадры».

Чтобы хорошо работать, пресс-фотограф должен знать свою камеру наизусть, досконально изучить все функции своего фотоаппарата: как снимать под дождем, в темноте и т. д. «Когда музыкант фальшивит, мы слышим сразу. Так и в фотожурналистике. Можно упустить хороший снимок из-за того, что не так навел фокус, не ту экспозицию поставил или не та оптика стояла».

А еще журналисты должны держать себя в форме: пресс-фотография требует больших физических усилий. Если снимаешь соревнования, придется побегать будь здоров, наматывая километры с камерой.

Каждый день появляются сотни новых фотографий в «Штерн», «Шпигель», «Нью-Йорк Таймс». Эти фото — заочная школа для начинающих фотографов. Кроме того, стоит учить английский, чтобы читать подписи к снимкам. Таким образом, можно, живя в провинции, учиться у признанных зарубежных мастеров и снимать интересно для своей газеты.

### О конкурсе

В конкурсе «Пресс-фото Беларуси 2010» приняли участие 96 белорусских фотографов, которые работают в национальных и зарубежных СМИ. На конкурс прислано более 1200 работ — одиночных снимков и серий в рубрики «Новости», «Люди в новостях», «Повседневная жизнь», «Спорт», «Портрет», «Искусство и развлечения», «Природа», «Гламур, реклама».

Организаторами конкурса выступили профессиональные фоторепортеры. В жюри вошли авторитетные фотографы и фоторедакторы разных стран. Среди них есть штатные сотрудники ведущих мировых агентств — Associated Press, Agence France-Presse. Итоги конкурса были подведены 12 мая.

### Участники и победители

В конкурсе приняли участие фотографы как государственных, так и негосударственных СМИ. Среди победителей — четыре представителя регионов: Василий Зенько (Столбцы), Александр Саенко (Гродно), Николай Титов (Могилев), Олег Рубченя (Слуцк). Большинство лауреатов конкурса живут и работают в Минске. Средний возраст участников — 38 лет. В списке лауреатов две девушки.

*За помощь в подготовке материала автор благодарит Алексея Матюшкова, фоторепортера и одного из организаторов конкурса.*



Алеся БЯЛЕНІК

Вядома, усіх не запросяць у Associated Press ці Reuters. І ў топ-10 самых наведвальных блогаў не ўцiснуць 25 дзённікаў. Лепшыя заўсёды будуць у маленькім адсотку. Аднак прафесійныя вышыні, якіх дасягаюць часам занадта вялікім коштам, павінны прымушаць удасканальвацца.

На школьных уроках музыкі і спеваў нам прыводзілі ў прыклад Чайкоўскага, які казаў, што геніяльнасць складаецца з 1% таленту і 99% катаржнай працы. Я з вялікім кампазітарам не пагаджалася: асабіста мяне бесперапыннае дзяўбанне па клавішах фартэпіяна музыкам не рабіла.

Майстэрства журналістыкі ў нечым падобнае да музыкі: можна скласці альбо добры слоўны накцюрн, альбо раздражняльную какафонію.

І гэтаксама ў журналістыцы ёсць свае майстры-рамеснікі, а ёсць геніі.

# Лекі ад застою мазгоў

## Да тэмы нефармальнай адукацыі журналістаў



### Шукаю сябе ў прафесіі

З апошнімі ўсё зразумела: Божую іскру атрымаць па ўласным жаданні немажліва. А вось зрабіцца добрым «рамеснікам» і навучыцца дакладна перадаваць людзям інфармацыю цалкам магчыма.

Наколькі добра гэта робіць інстытуцкая адукацыя, сказаць цяжка. Сцены БДУ могуць гартаваць каго заўгодна: зашораных, але ідэалагічна завостраных тэлезорак, індыферэнтных да любой ідэалогіі шарагоўцаў ці рэпарцёраў, якія крытычна ставяцца да ўсяго, што дзеецца вакол. Сучасныя мас-медыі ў большай ступені ствараюцца акурат журналістамі без адпаведнай адукацыі. Асабліва гэта тычыцца візуальнага кірунку і вэб-журналістыкі — новыя медыйныя тэхналогіі беларускія ВНУ проста не ў стане хутка засвоіць і, адпаведна, перадаць студэнтам. Таму вялікую ролю ў падвышэнні кваліфікацыі нашых журналістаў адыгрывае нефармальная адукацыя. Балазе, існуюць фонды і арганізацыі, якія ладзяць рознага кірунку мерапрыемствы, дзе можна навучыцца чаму заўгодна: ад «пірамiды навін» да тэхналогіі стварэння аўдыёвізуальнага медыйнага праекта. Ладная частка сённяшніх карэспандэнтаў беларускіх інфармацыйных сродкаў атрымала прафесійную адукацыю на семінарах у Кіеве, Швецыі ці Варшаве, на курсах, так бы мовіць, перападрыхтоўкі кадраў.

***Крысціна Карчэўская, мультымедыяжурналіст і інфармацыйны вядучы Еўрапейскага радыё для Беларусі*:**

*— Нефармальная адукацыя — найлепшая з формаў атрымання ведаў асабіста для мяне. Па адукацыі я фізік, а па прызванні — журналіст,*



прычым зразумела я гэта менавіта дзякуючы нефармальным адукацыйным трэнінгам па журналістыцы ўсіх кірункаў. Напрыклад, Еўрапейскае радыё для Беларусі зрабіла мяне радыёжурналістам, а Белсат навучыў асновам відэажурналістыкі. Я прайшла цудоўную крэатыўную школу мультымедыячасопіса «34», дзе займалася ўсімі відамі журналістыкі. Нефармальная адукацыя дае больш, чым паперку, дыплом ці яшчэ нейкую ўмоўнасць. Яна дае самае галоўнае: практычныя навыкі і насамрэч карысныя для працы веды.



То бок, калі пастарацца і прадумана абраць з даволі вялікага шэрагу прапановаў патрэбныя па тэмах трэнінгі, семінары ці стажыроўкі, можна атрымаць неблагую журналісцкую падрыхтоўку. А галоўнае — мінімальна тэарэтызаваную, скіраваную на практычны падыход.

## Не забі ў сабе журналіста

Атрыманне журналісцкіх навыкаў праз нефармальнае навучанне відавочна карысная і эфектыўная штука для рэпарцёраў-пачаткоўцаў. Аднак яна аказваецца яшчэ больш патрэбнай тым, хто ўжо гадамі сядзіць за рэдакцыйным камп’ютэрам і піша чарговую навіну з прэс-рэлізу раённага аддзела ўнутраных спраў.

Здаецца, што прасцей? Існуюць дакладна распрацаваныя каноны, у якія трэба ўкласці тую самую навіну. Журналісты-пачаткоўцы, незалежна ад таго, дзе атрымалі адпаведныя навыкі, спрабуюць яшчэ прытрымлівацца тае «піраміды». Але рэдакцыйная праца — гэтае страшнае слова «цякучка», калі не паспяваеш то ўзяць каментар, то пацвердзіць інфармацыю, — паступова фармуе ўласныя «каноны» пабудовы матэрыялаў. Ад цябе патрабуюць хутка і шмат, ды не за фантастычныя грошы, і тут не да выкшталцонасцяў. Гэтая самая цякучка можа паступова журналіста забіць: страчваеш цікаўнасць, здольнасць здзіўляцца, шукаць справядлівасці, увесь час задаваць пытанні ці бачыць звычайныя рэчы ў іншым ракурсе.

Можна сядзець у сваёй рэгіянальнай газеце і імкнуцца запаўняць палосы хоць чым-небудзь, абы хапіла на патрабаваны рэдактарам аб’ём. Тое самае можна рабіць, працуючы ў рэспубліканскім выданні, «чэсна» адпрацоўваючы заробак. Пры гэтым паступова страчваецца чыста прафесійны азарт, змяншаюцца амбіцыі і спрашчаецца падыход да сваёй журналісцкай працы.

Аднойчы стала сведкай дыялога паміж украінскім журналістам (дасведчаным, запатрабаваным і ўвогуле няблага раскручаным) і малдаўскай калегай (дзяўчына літаральна гады два працуе ў невялікай газеце).

— Чаму не маеце ўласнага блога? — пытанне ўкраінскага журналіста.

— Бо мне за яго не плацяць. Нашто напружвацца?

— Дык гэта твой твар, гэта найлепшы сродак раскруткі сябе, прасоўвання сваіх ідэяў, найхутчэйшы спосаб перадаць інфармацыю. Інвестыцыі ў сваё імя — гэта больш за дадатак да заробку ў некалькі дзесяткаў даляраў, — пераконвае ўкраінец.

Акурат камунікацыя з старэйшымі ці больш паспяховымі калегамі можа падштурхнуць да таго, каб паглядзець на сябе звонку, задумацца над сэнсам сваёй працы, азірнуцца і, магчыма, убачыць сябе жыхаром балота, што для журналіста проста смяротна.

***Наталля Якавенка, фрылансер:***

*— Мне даводзілася нямала бываць на нефармальных адукацыйных мерапрыемствах для журналістаў, і штораз гэта было карысна для павышэння прафесійнага ўзроўню. Кожны раз я*



*па-новаму глядзела на свае прафесійныя задачы і знаходзіла нейкія новыя ідэі. Акрамя таго, я пераконвалася, што нешта раблю менавіта так, як трэба, развейваліся пэўныя сумненні, я набывала ўпэўненасць у сабе. Да таго ж кожны раз завязваліся новыя кантакты з калегамі, што забяспечвала і надалей абмен досведам, а гэта надзвычай каштоўна. Такія мерапрыемствы даюць мажлівасць паглядзець на сваю працу звонку, убачыць яе вартасці і недахопы, знайсці шляхі для абнаўлення сваёй прафесійнай дзейнасці і пазбегнуць застою.*

Безумоўна, гэта магчыма, калі толькі ёсць жаданне і імкненне пашырыць свае далягляды. Бо на пэўных трэнінгах можна назіраць, як ужо сталы, «мацёры» журналіст, які з дзесятак гадоў працуе ў выданні, элементарна не здольны напісаць добры лід. Горш за тое — не ўсе гатовыя ўсвядоміць, што такая сітуацыя не ёсць дапушчальнай. Ганарлівасць і самаўпэўненасць могуць перашкодзіць развіццю, не дазваляюць атрымаць штуршок для наступнай працы нават на самым круцейшым занятку з мегатрэнерам. Выкрыванне рэжыму — гэта файна, але часам нашым «акулам пяра» катастрафічна не хапае самакрытычнага падыходу да напісанага.

***Настасся Зелянкова, інтэрнэт-газета «Салідарнасць»:***

*— Увогуле лічу, што лішніх ведаў не бывае. Па-першае, на такіх трэнінгах я запаўняю прабелы ў адукацыі, бо па спецыяльнасці з'яўляюся філолагам, а не журналістам. Па-другое, нават калі і даводзіцца чуць пра нешта добра знаёмае, выкарыстоўваю гэта як магчымасць сістэматызаваць свае веды. Каб быць адметным і мецьсвой стыль у журналістыцы, трэба спачатку навучыцца рабіць «як усе». Ствараць нешта арыгінальнае, парушаючы законы жанру, можна толькі добра тыя законы ведаючы.*

## Заблукалыя зоркі

Адна з праблемаў розных нефармальных мерапрыемстваў — гэтак званыя турысты. Такія ўдзельнікі «забіваюць» на занняткі (у лепшым выпадку — фармальна прысутнічаюць, у горшым — проста ігнаруюць) і тусуюцца ў іншым горадзе ці краіне па праграме «ўсё ўключана». Прычым выявіць такіх удзельнікаў на адборачным этапе даволі цяжка: скласці добры матывацыйны ліст ці запоўніць анкету можна навучыцца хутка.

***Наталля Якавенка, фрылансер:***

*— Я штораз бачыла на такіх мерапрыемствах людзей, якім было нецікава і якія адкрыта прызнаваліся ў тым, што ім гэта не трэба. Яны прыязджаюць з розных прычын: для некага гэта сродак павышэння па службе, для некага — магчымасць адпачыць ад працы, бясплатна выехаць за мяжу, калі мерапрыемства адбываецца недзе там. Звычайна ў групе абавязкова ёсць некалькі такіх чалавек, і добра, калі яны хаця б не перашкаджаюць астатнім, каму гэта цікава. Так часам крыўдна бывае, калі разумееш, што на іх месцах маглі быць зацікаўленыя людзі, сапраўдныя прафесіяналы, якія імкнуцца да самаўдасканалення.*

Магчыма, разбэшчвае людзей акурат тое, што ўсё аплачана. Калі журналіст усведамляе неабходнасць падвышаць свой узровень, ён будзе гатовы зрабіць нейкі ўнёсак і паставіцца да семінара інакш. З іншага боку, для маладых людзей гэта можа стаць перашкодай: сума нават у 50 даляраў часам бывае непад'ёмнай. Зрэдку здараецца, што колькасць прапановаў перавышае колькасць патэнцыйных удзельнікаў — тады запрашаюцца ўсе ахвотныя, абы запоўніць групу. Але недзе ў арганізатараў ёсць і «чорныя спісы»...

## Have fun

Самая эфектыўная частка семінараў — вечаровыя кулуарныя размовы. Так лічыць большасць удзельнікаў нефармальных мерапрыемстваў. Усё, што не трапляе ў друк, у аб'ектыў камеры, абмяркоўваецца з усіх бакоў за кавай з цыгарэтамі. Гэта той момант, калі нараджаюцца новыя праекты, ідэі, рашэнні і ініцыятывы. Распавядаюцца-пераказваюцца журналісцкія пужалкі, байкі, анекдоты і праўдзівыя гісторыі пра сустрэчы на вышэйшых узроўнях ды візіты АМАПаўцаў у рэдакцыі. Для пачаткоўцаў гэта ўнікальная магчымасць пачуць пра нялёгкія працоўныя будні і фантастычныя журналісцкія знаходкі, дзеля якіх і ідуць у гэтую прафесію.

Гэта сутыкненне і прымірэнне журналістаў з двух лагераў — «чэсных» і «нячэсных». У «кулуарах» — самае эфектыўнае наладжванне кантактаў. Акурат там фармуюцца журналісцкія супольнасці і гартуецца дух прафесійнай салідарнасці.

А што да асабістага... За рэдкім выключэннем калегі відавочна падрастаюць у тваіх вачах. А ты — у іх.

# Вакол «вышкі»

**Так называлася адна з тэм, прапанаваных журналістам для выканання задання падчас навучальнага дыстанцыйнага майстар-класа «Аналітычная журналістыка. Прававыя выклікі для журналістаў-аналітыкаў». Курс стаўся першым у доўгатэрміновым праекце, які ладзіць БАЖ сумесна з Нарвежскім Хельсінкскім камітэтам для беларускіх журналістаў.**





*Алена ЛАПЦЁНАК* *Ірына ПРАКОПЧЫК*

Кіраўнік праекта, вядомы журналіст Юрась Карманаў запэўнівае, што майстар-класы будуць праводзіцца па розных кірунках і жанрах (фота, радыё, анлайн-журналістыка і іншыя) і разлічаны на актыўны, творчы падыход удзельнікаў, павышэнне прафесійнага майстэрства. Цягам трох месяцаў удзельнікі майстар-класа маюць магчымасць атрымаць базавыя веды ў абранай галіне журналістыкі. Акрамя навучальных матэрыялаў вядоўцы прапануюць практычныя заданні, тэсты, дыскусіі, форумы, анлайнавыя кансультацыі. Агульным для ўсіх дзевяці майстар-класаў з'яўляецца пэўны праваабарончы ўхіл з мэтай навучыць пераканаўча падаваць надзённую для Беларусі праваабарончую тэматыку і ўмела абараняць свае прафесійныя правы.




### У фокусе праблемы

Майстар-клас па аналітычнай журналістыцы стартаваў у красавіку. У ліпені на агульнай сустрэчы былі падведзены вынікі. Цэнтральная тэма менавіта гэтага навучання — праблематыка смяротнага пакарання ў Беларусі. «Вакол «вышкі» разгарнуліся найбольш вострыя дыскусіі, удзельнікі курса прызнаюць, што тэма аказалася адной з самых складаных. Фактычна гэтая навучальная група паралельна стала і фокус-групай у даследаванні стаўлення да праблемы смяротнага пакарання. Высветлілася, што самі журналісты маюць патрэбу ў ведах і больш глыбокім асэнсаванні гэтай тэматыкі.

Дыскусія паказала: часам мы трапляем у палон падманных альтэрнатыў. Навошта, напрыклад, ставіць пытанне пра скасаванне смяротнага пакарання, калі ў нас існуюць аборты? Калі падчас трэнінгу было прапанавана канкрэтнае заданне «Вакол «вышкі», то далёка не ўсе ўдзельнікі адважыліся яго выконваць. І, паколькі існавала магчымасць выбару, палічылі за лепшае ўзяць больш знаёмую тэматыку, дзе значна лягчэй расставіць акцэнты. У пэўным сэнсе тэма смяротнага пакарання палохае журналістаў сваёй неадназначнасцю. Многія аказаліся не гатовыя брацца за праблему кваліфікавана, з годнай аргументацыяй падысці да напісання матэрыялу.

Па меркаванні арганізатараў навучальнага працэсу, журналісты ў значнай ступені адлюстроўваюць стан нашага грамадства, у тым ліку і нейкія забабоны, датычныя праблематыкі смяротнага пакарання. Таму ўзнікае патрэба ў сістэмнай адукацыі журналістаў, каб тыя, у сваю чаргу, былі здольныя патлумачыць грамадству неабходнасць шырокага абмеркавання гэтай тэмы.



*На прэс-канферэнцыі праваабаронцаў выступае прадстаўніца Amnesty International, эксперт па Беларусі Хэза Макгіл*

А тлумачыць насамрэч ёсць што. Улады спекулююць на выніках рэферэндуму 1996 года, калі большасць грамадзянаў выказалася за захаванне смяротнага пакарання. Але, безумоўна, за мінулыя 14 гадоў адбыліся змены ў грамадскай свядомасці, і зараз дадзеныя, да прыкладу, Незалежнага інстытута сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД) і сацыяметрычнай лабараторыі «НОВАК» паказваюць, што колькасны разрыў паміж прыхільнікамі і праціўнікамі смяротнага пакарання адносна невялікі. Акрамя таго, на момант правядзення рэферэндуму ў крымінальным заканадаўстве краіны не існавала такой меры пакарання, як пажыццёвае зняволенне (тое было ўведзена толькі праз год).

З другога боку, людзей не інфармуюць ці робяць закладнікамі стэрэатыпнага погляду: свядома — афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі, часцей несвядома — недзяржаўныя СМІ. Бо для таго, каб нармальна тлумачыць праблематыку смяротнага пакарання іншым, найперш самі журналісты мусяць разбірацца ў ёй да нюансаў.




### Аднабаковасць поглядаў

Да гэтага часу ў Беларусі праблема смяротнага пакарання так і не стала прадметам вострай дыскусіі ў грамадстве, нягледзячы на тое, што Еўрасаюз не дае афіцыйнаму Мінску забыцца на гэта пытанне. Пэўнае «ажыўленне» вакол тэмы звязана менавіта з палітычным аспектам: галоўным чынам абмяркоўваецца «кошт пытання» ў «гандлі» паміж еўрачыноўнікамі і беларускімі ўладамі. Аднак ні ў палітычных баталіях, ні ў СМІ практычна не закранаюцца іншыя аспекты, раскрыццё якіх зробіць сутнасць праблемы больш зразумелай для шырокіх колаў грамадзян.

Тое, што для паўнавартаснага абмеркавання магчымасці адмены смяротнага пакарання народ трэба рыхтаваць, кіраўніцтва дзяржавы добра разумее. Яшчэ ў лістападзе мінулага года Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю італьянскай газеце «La Stampa» заявіў, што «ў бліжэйшы час» будзе праводзіцца інфармацыйная кампанія, якая «зрабіла б пытанне аб магчымай адмене ў Беларусі пакарання смерцю больш адчувальным для насельніцтва», казаў пра ўзняцце гэтай праблемы ў СМІ. Кіраўнік парламенцкай групы па абмеркаванні праблематыкі смяротнага пакарання Мікалай Самасейка таксама адзначаў, што для адмены гэтай меры барацьбы са злачыннасцю трэба паступова змяняць грамадскую думку, найперш праз СМІ. Прытым дэпутат падкрэсліваў колькасную перавагу прыхільнікаў захавання смяротнай кары.

Але кіраўнік лабараторыі «НОВАК» Андрэй Вардамацкі па выніках сацыялагічнага апытання ў 2009 годзе адзначаў, што пэўная медыйная падача не імгненна, але можа зменшыць розніцу ў колькасці прыхільнікаў і праціўнікаў адмены смяротнага пакарання і нават памяняць бакі месцамі. Падобнае меркаванне наконт дзейснасці працы з грамадскай думкай выказваў і былы старшыня Савета рэспублікі, акадэмік Аляксандр Вайтовіч. Ён перакананы, што адмена смяротнага пакарання будзе ўспрынята шырокімі коламі грамадства нармальна. «І калі б паставілі на рэферэндум, то пры неабходнай растлумачальнай працы гэта было б ухвалена і на рэферэндуме», — упэўнены Вайтовіч.

Даследчыкі розных аспектаў праблемы смяротнага пакарання сыходзяцца ў тым, што ў людзей пры абмеркаванні гэтай тэмы дамінуюць эмацыйны фактар, матывацыя адплаты, а таксама кансерватыўныя, не аднаму пакаленню «ўкладзеныя ў вушы» пастулаты пра эфектыўнасць найбольш суровай меры барацьбы са злачыннасцю. На гэта ёсць розныя прычыны: нестабільнасць сацыяльна-эканамічнага стану грамадства і крымінагенная сітуацыя, неэфектыўнасць барацьбы са злачыннасцю, адчуванне неабароненасці ў людзей і г. д. Да таго ж інфармацыі пра складанасць і супярэчлівасць праблемы смяротнага пакарання шырокія слаі насельніцтва папросту не маюць, яны не знаёмыя ні з тэндэнцыямі ў практыцы выкарыстання смяротнай кары, ні з драматычнымі момантамі прыняцця рашэння па канкрэтнай крымінальнай справе, не могуць уявіць жах чакання, формы выканання прысуду. Людзі выходзяць толькі з уяўленняў, якія ўзнікаюць на аснове эмацыйных фактараў, пад уражаннем трагедыі канкрэтных злачынстваў. Паводле экспертаў, вельмі ўплывае на грамадскую думку няпоўная, фрагментарная і супярэчлівая інфармацыя ў СМІ.

Меркаванні людзей, вядома, залежаць і ад ступені праўдзівасці інфармацыі, якую

распаўсюджваюць журналісты. Эксперты запэўніваюць у неабходнасці фарміравання інфармацыйнай палітыкі, накіраванай на агульную гуманізацыю нораваў, на карэкцыю міфалагічных уяўленняў людзей пра задачы і магчымасці прававыкарыстальнай практыкі, на ўкараненне праваабарончых ідэй у грамадскую свядомасць.

### Важнасць ролі масмедыя

Што перашкаджае журналістам — прыхільнікам дэмакратычных каштоўнасцяў перавесці асвятленне праблемы смяротнага пакарання з палітычнай плоскасці ў маральную і прававую? Зразумела, не хапае інфармацыі, бо ў нашай дзяржаве існуе табу на любыя звесткі пра смяротнае пакаранне, яны закрытыя і неўпарадкаваныя. Аднак пры пэўных намаганнях незалежных медыяў ёсць шанц прыцягнуць увагу насельніцтва краіны да найбольш істотных аспектаў смяротнай кары. І прадстаўнікі праваабарончай супольнасці заяўляюць, што заўсёды гатовыя да шчыльнага супрацоўніцтва ў гэтым пытанні.

Праваабаронца, старшыня Беларускага Хельсінкскага камітэта Алег Гулак зазначае, што грамадскія арганізацыі могуць праводзіць адмысловыя кампаніі. Бо, напрыклад, на канферэнцыях ці круглых сталах, прысвечаных праблематыцы смяротнага пакарання ў Беларусі, нікога запэўніваць не трэба, удзельнікі і без таго ўсё разумеюць. А вось працаваць з грамадствам варта заўсёды, нават пасля ўвядзення мараторыя на смяротнае пакаранне. Бо сам мараторый з'яўляецца канкрэтным вынікам, а галоўная задача значна глыбейшая — гуманізацыя грамадства. І тут роля журналістаў вельмі важная.



*Праваабаронцы «Вясны» Валянцін Стэфановіч і Алесь Бяляцкі накіроўваюцца на акцыю пратэсту супраць прывядзення ў выкананне двух смяротных прысудаў. Мінск, 23.03.2010*

На думку медыяэксперта, аналітыка БелаПАН Аляксандра Класкоўскага, у Беларусі дэфармаванае грамадства. «Еўропа даўно ўжо асэнсавала гэтае пытанне, там фактычна няма дыскусіі — цэлы кантынент адмовіўся ад смяротнага пакарання. У нас наўмысна трымаюць людзей на такім першабытным узроўні, на прынцыпе «вока за вока, зуб за зуб», таму што гэты прынцып, дарэчы, шмат у чым рэалізуецца ў дзяржаўнай палітыцы, калі трушчаць апанентаў, называючы іх адмарозкамі, якія замахнуліся на святое», — лічыць А. Класкоўскі. Ён адзначае, што пашыранасць даволі цемрашальскіх поглядаў на праблему смяротнага пакарання — у значнай ступені віна дзяржавы і цяперашняй палітыкі. Бо асэнсаванне гэтай праблемы патрабуе грамадзянскасці, чалавек павінен адчуваць сябе грамадзянінам, а гэта не выгодна цяперашнім уладам. На думку аналітыка, Беларусі патрэбна ратацыя ўлады, патрэбна больш сучасная палітычная сістэма, у межах якой вырашаліся б адэкватна, як гэта належыць у XXI стагоддзі, і такія пытанні, як праблема смяротнага пакарання.

З пачатку 2009 года ў Беларусі праводзіцца кампанія «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання» з мэтай далучэння нашай дзяржавы да агульнаеўрапейскіх каштоўнасцяў. Праваабаронцы расцэньваюць факт існавання смяротнага пакарання як выразнае сведчанне жорсткасці беларускай рэпрэсіўнай сістэмы, якая ўключае ў сябе суды, пракуратуру і месцы ўтрымання вязняў. Прадстаўнікі праваабарончай супольнасці краіны падрыхтавалі адпаведную петыцыю. Гэты зварот за подпісамі вядомых беларускіх дзеячаў 10 снежня 2009 года, у Міжнародны дзень правоў чалавека, быў перададзены ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі і Парламент. Збор подпісаў працягваецца, і кожны грамадзянін Беларусі можа далучыцца да петыцыі на сайце www.spring96.org. Тамсама можна азнаёміцца з тэматычнай падборкай матэрыялаў.

Адна з галоўных задачаў кампаніі — распачаць дыскусію ў грамадстве па праблеме смяротнага пакарання. І ў гэтым прадстаўнікі праваабарончай супольнасці вельмі разлічваюць на дапамогу журналістаў.




www.baj.by

# 15 гадоў таму ўпершыню выйшла ў эфір Радыё 101.2

Працэс рэгістрацыі новай беларускай FM-радыёстанцыі распачаўся яшчэ ўзімку 1994-га — праз некалькі месяцаў пасля ліквідацыі «Беларускай маладзёжнай», амаль увесь калектыў якой на знак пратэсту звольніўся з дзяржаўнага радыё.

*«Мы зарэгістравалі радыёстанцыю (101.2) акурат напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў (чэрвень 1994 г.). На гэты момант у нас на руках ужо было рашэнне аб вылучэнні частаты»*, — узгадвае **Жанна Літвіна**, былая галоўная рэдактарка зачыненай «БМ». (Не выключана, што ўсё прайшло гладка, бо яе прозвішча ў рэгістрацыйных дакументах новага радыё не фігуравала.)

Адначасова ў беларускае прадстаўніцтва Фонду Сораса накіравалі заяўку аб выдаткаванні грошай на перадатчык для новай беларускай FM-радыёстанцыі. У канцы жніўня 1994 г. Рада Фонду вырашыла пытанне станоўча.

Аднак у эфір Радыё 101.2 выйшла толькі праз год. Ішоў мантаж радыёперадатчыка, рамантавалася памяшканне на другім паверсе дома па вул. Рэвалюцыйнай, 8а, абсталёўвалася радыёстудыя, распрацоўвалася сімволіка.

Акрамя Жанны Літвіной, вырашэннем «аргпытанняў» займаліся **Міхаіл Князевіч** (адзін з заснавальнікаў і выканаўчы дырэктар радыёстанцыі), гукарэжысёр дзяржаўнага радыё **Дзмітрый Новікаў** (дырэктар новай радыёстанцыі), а таксама цэлая каманда іншых інжынераў і гукарэжысёраў з дзяржрадыё, якія захавалі сяброўскія сувязі з «Беларускай маладзёжнай» і збіраліся пры спрыяльным развіцці падзеяў змяніць месца працы. На пасаду камерцыйнага дырэктара радыё прыйшоў **Дзмітрый Бандарэнка**.

Пасля падключэння абсталявання надышоў перыяд творчай падрыхтоўкі: адбору музычных носьбітаў (дыскаў, касет, кружэлак), запісу першых «шапак» і джынглаў... Спачатку фанатэка радыё складалася галоўным чынам з асабістых архіваў гукарэжысёраў, а таксама з дыскаў,

падараваных калегамі з польскіх радыёстанцый. Пазней радыё падпісалася на рассылку зборнікаў новых хітоў ад амерыканскай кампаніі TM Century і ўвесь час папаўняла сваю «калекцыю» музыкай ад карпарацыі «Бі-бі-сі».

Роздумы над назвай новага радыё прывялі да ідэі «раскручваць» саму частату: каб запомнілі, дзе шукаць. Гэтае рашэнне (як і, бадай, усе рашэнні ў той час) прымалася калектыўна.

Першы выхад у эфір Радыё 101.2 адбыўся 21 ліпеня 1995 г. Гэта была трохгадзінная тэставая «вылазка» з першымі гатовымі на той час джынгламі і музыкай.

Першай песняй, якая прагучала ў эфіры Радыё 101.2, была «We're Not Gonna Take It» гурту «Twisted Sister». Гэта быў выбар Дзмітрыя Новікава, які сумяшчаў абавязкі дырэктара і гукарэжысёра і падчас першага эфіру працаваў за пультам.

*«У параўнанні з "Роксам" ці "Бі-Эй" у нас больш цяжкой музыкі. І мы гэтага не баімся. Нам бы хацелася разлічваць на маладзёжную аўдыторыю»*, — казаў Дзмітрый у тагачасных інтэрв'ю. (Тады адзінымі «суседзямі» ў беларускай FM-прасторы былі сапраўды толькі дзве згаданыя радыёстанцыі.)

Музычная палітыка радыёстанцыі шмат у чым вызначалася асабістымі густамі вядоўцаў і гукарэжысёраў — асабліва на першым этапе існавання радыё. Адзінае правіла, якое было ўведзена ад самага пачатку, — прынцыповая адмова ад рускамоўных песень у эфіры. Выключэнні рабіліся толькі для анансавання канцэртаў рускіх гуртоў, інфармацыйнымі спонсарамі якіх было Радыё 101.2, альбо падчас інтэрв'ю, калі рускія музыкі прыходзілі ў студыю.

Калі рубам паўстала пытанне прыцягнення рэкламадаўцаў, кіраўніцтва радыёстанцыі вымушана было дыктаваць пэўныя ўмовы датычна музычнай палітыкі: так, была ўведзена дзённая «хітгадзіна», вызначана, які мінімум «папулярных» песень мусіць прагучаць за пэўны адрэзак часу, і г. д. Але нават пасля гэтага па музыцы, што гучала ў эфіры Радыё 101.2, амаль беспамылкова можна было вызначыць, які гукарэжысёр сядзіць у гэты момант за пультам, а хто «руліць» у студыі. Магчыма, такая схема працы была нежыццяздольнаю, але шмат хто ўпэўнены, што гэтыя спробы рабіць «аўтарскае радыё» былі значна цікавейшымі за сённяшнія ўніфікаваныя плэй-лісты.

Эфіры і аўтарскія праграмы вяліся толькі пабеларуску. Выключэнне рабілася для інтэрв'ю ў жывым эфіры, калі суразмоўцы кепска валодалі беларускай мовай. *«Гэта было безумоўным доказам таго, што беларуская мова не шкодзіць справе, а наадварот — дапамагае. Нам гэта адразу дапамагло пазіцыянаваць сябе, вылучыцца сярод рускамоўных станцый»*, — тлумачыў у адным з інтэрв'ю Дзмітрый Бандарэнка.

Напачатку «касцяк» радыёвядоўцаў 101.2 складалі нядаўнія супрацоўнікі «БМ», а таксама іншых рэдакцый дзяржаўнага радыё, якія былі незадаволеныя працай у дзяржструктуры і ахвотна далучыліся да новай справы: **Ірына Курапаткіна**, **Генадзь Кеснер**, **Сяргей Ахрамовіч**, **Сяргей Лабандзіеўскі**, **Іна Студзінская**, **Алесь Дайнэка**, **Дзмітрый Лукашук**, **Алесь Хмяльніцкі**, **Вольга Бабак**. Праўда, частка «БМаўцаў» на FM-станцыю не пайшла: у момант яе адкрыцця некаторыя з іх ужо працавалі карэспандэнтамі замежных СМІ ў Беларусі — да прыкладу, **Алена Радкевіч** і **Віталь Сямашка**.

Паступова да «стоадзінаўскай» суполкі далучаліся ўсё новыя людзі: **Вольга Караткевіч**, **Юрась Бушлякоў**, **Вольга Гардзейчык**, **Севярын Квяткоўскі**, **Жанна Радзівонава**, **Марцін Латэцкі**, **Іван Бялоўскі**, **Таццяна Шунтава**, **Павел Каранеўскі**... Некаторыя з іх, пачаўшы з аўтарскіх праграм, паступова засвойвалі і вядзенне эфіру. Новыя супрацоўнікі, як правіла, надзвычай арганічна «ўрасталі» ў калектыў, і



*Расійскі гурт «ЧайФ» рыхтуецца да інтэрв'ю. Злева направа: Дзмітрый Лукашук, Ірына Курапаткіна, музыкі «ЧайФ». На першым плане — гукарэжысёр Дзмітрый Новікаў*

хутка ўжо ніхто не памятаў, хто калі трапіў «у сям'ю».

*«Так заўсёды адбываецца: збіраецца некалькі таленавітых людзей, якія потым пачынаюць працаваць як магніт, збіраючы вакол сябе гэткіх жа неардынарных асобаў»*, — узгадвае Жанна Літвіна.

З гукам на радыё працавалі **Дзмітрый Новікаў**, **Уладзімір Сакульскі**, **Анатоль Додзь**, **Дзмітрый Васількоў**, **Алеся Верас**, **Сяргей Лабандзіеўскі**, **Алесь Ляшкевіч**. Праца адбывалася па старой «дзяржрадыйнай» схеме: вядоўца знаходзіўся ў студыі перад мікрафонам, а за ўсё гукавое афармленне адказваў гукарэжысёр. То бок радыджэяў у традыцыйным разуменні гэтага слова на 101.2 не было.



***У офісе на Рэвалюцыйнай, 8а — аўтары і вядоўцы праграмы «ТВ-дэнс» Іван Бялоўскі і Таццяна Шунтава (на другім плане) і гукарэжысёр Анатоль Додзь***

Рэжым працы на радыё быў даволі складаны. Начныя «вахты» былі нормай, асабліва для гукарэжысёраў: адзіная радыёстудыя служыла як эфірнай, так і вытворчай пляцоўкай, таму запісваць новыя праграмы альбо застаўкі можна было толькі пасля заканчэння эфіру. Радыйнае кіраўніцтва планавала прасторавае пашырэнне і ўжо разгарнула рамонт памяшканняў па суседстве, рыхтуючы іх пад новыя студыі. Але гэтыя планы так і засталіся нерэалізаванымі…

Радыё 101.2 пазіцыянавала сябе як «Гарадскі канал», бо магутнасці перадатчыка, усталяванага ў цэнтры Мінска (вул. Камуністычная), хапала толькі на сталіцу і некалькі дзесяткаў кіламетраў вакол яе. Максімальная адлегласць ад Мінска, на якой можна было чуць 101.2, складала каля 70–80 км.

Тым не менш гарадской інфармацыяй Радыё 101.2 яўна не збіралася абмяжоўвацца. Ужо ў 1995 г. была падпісаная дамова з Сусветнай службай Бі-бі-сі: брытанская карпарацыя прыслала ў Мінск свайго прадстаўніка, які ўсталяваў на даху будынка на Рэвалюцыйнай, 8а спадарожнікавую антэну для прыёму праграм з Лондана. Штодзённа радыё запісвала і перакладала выпускі навінаў Бі-бі-сі, а таксама цэлы шэраг ліцэнзійных музычных праграм («Шоў Джона Піла», «Multitrack X-press», «Vintage Chart Show» і іншыя).

Аналагічная дамова была падпісана і з Рускай службай «Нямецкай хвалі». Штодня цэлую гадзіну на хвалі Радыё 101.2 вяшчала Беларуская служба Польскага радыё.

Некаторыя архіўныя публікацыі захавалі расклад інфармацыйных праграм Радыё 101.2 прыкладна праз паўгода пасля пачатку яго існавання.

ГРАФІК ВЫХАДУ ПРАГРАМ РАДЫЁ 101.2:

**8.00 — пачатак працы**
**8.10–8.40 — дайджэст прэсы**
**9.30–9.45 — бізнес-агляд**
**10.00–10.05 — замежныя навіны**
**11.00–11.05 — навіны Беларусі**
**12.00–12.05 — навіны Бі-бі-сі**
**13.00–13.05 — выпуск навінаў БелаПАН**
**14.00–14.05 — навіны**
**15.00–15.05 — «Сталічны экспрэс» (гарадскія навіны)**
**16.00–16.05 — навіны (БелТА, БелаПАН)**
**16.15–16.45 — Бі-бі-сі (ліцэнзійныя музычныя праграмы)**
**17.00–17.05 — дайджэст навінаў**
**17.30–18.00 — праграма, падрыхтаваная Беларускай службай Польскага радыё**

АЎТАРСКІЯ ПРАГРАМЫ:

**10.15–11.00 — «ТВ-дэнс» — танцавальная праграма Т. Шунтавай, І. Бялоўскага (нядзеля)**
**11.15–11.45 — «Бізнес-актуаліі» В. Караткевіч (серада, пятніца)**
**11.15–12.00 — «NRG» С. Квяткоўскага, перадача пра французскую музыку (нядзеля)**
**11.30–11.45 — «Квадракола» Л. Вольскага, гумарыстычная праграма (субота)**
**12.15–12.45 — «Музыка тоўстых» Д. Падбярэзскага, джазавая праграма (аўторак)**
**12.30–12.45 — «ПраРОК» К. Камоцкай, музычная перадача (пятніца)**
**12.30–12.50 — «Паехалі!» В. Бабак, аўтапраграма (чацвер, субота)**
**13.15–13.40 — «Ad okulus» М. Латэцкага, агляд навінак відэа (нядзеля)**
**16.45–17.00 — «Бабілёнская бібліятэка» Ю. Бушлякова, літаратурная перадача (панядзелак)**

Падыход да аўтарскіх праграм уласнай вытворчасці быў досыць дэмакратычны: ніякіх адмысловых патрабаванняў, абмежаванняў (акрамя часавых) не выстаўлялася. Эксперыментатарства часам межавала з хуліганствам у эфіры, але, безумоўна, прыцягвала дадатковую ўвагу да радыёстанцыі і нават «задавала стыль», які пераймалі і іншыя тагачасныя радыйцы. Зрэшты, найбольш яскравыя «прыколы» Радыё 101.2 рупліва сабраныя ў кнізе Севярына Квяткоўскага «Фрашкі да пляшкі», у раздзеле «Флюіды 101.2» (http://kamunikat.org/halounaja.html?pubid=1742).

Прыгадвае лідэр гурта N.R.M. **Лявон Вольскі**, адзін з супрацоўнікаў радыё: *«Гэта была абсалютна нетутэйшая структура. Бо не было гэтай вечнай боязі сказаць штосьці не тое альбо штосьці не тое паставіць музычнае. Моладзь пачала слухаць менавіта Радыё 101.2. Бо там былі і альтэрнатыўная музыка, і сучасная музыка. У нас, бадай, нічога падобнага няма ў краіне і не было ніколі».*

Радыё 101.2, дарэчы, першым пачало практыкаваць выступы музычных гуртоў у жывым эфіры, нягледзячы на сціплыя памеры студыі. Гэтыя эксперыменты ладзіліся ў межах праграмы Касі Камоцкай «ПраРОК». Ёсць вялікая верагоднасць таго, што першы «жывы» выступ гурта N.R.M. адбыўся менавіта ў эфіры гэтай праграмы.

Офіс на Рэвалюцыйнай, 8а быў сапраўдным культурніцкім асяродкам, вакол якога збіраліся знакавыя для Беларусі фігуры. Акрамя **Лявона Вольскага** і **Касі Камоцкай**, якія працавалі на радыё, частымі гасцямі на «стоадзінцы» былі **Аляксандр Памідораў**, **Дзмітрый Вайцюшкевіч** і **Вераніка Круглова** («Kriwi»), **Міхал Анемпадыстаў** (аўтар тэкстаў будучага «Народнага альбома»), **Юрый Авяр'янаў** (артыст тэатра імя Я. Купалы, які ў хуткім часе пайшоў з жыцця) і многія іншыя.

Улетку 1996-га, нягледзячы на тое, што лета лічыцца самым бесперспектыўным для пошуку рэкламы часам, фінансавае становішча Радыё 101.2 пачало стабілізавацца, і радыёстанцыя выйшла на самаакупнасць. (У рэкламным аддзеле радыё паспяхова працавалі, акрамя Дзмітрыя Бандарэнкі, **Вольга Сарако** і **Ганна Лабай**.)

Шмат хто звязваў падвышэнне рэйтынгу з інфармацыйнымі выпускамі, якія вылучалі станцыю сярод астатніх, цалкам апалітычных — тым больш з улікам таго, што доступ да непадцэнзурнай інфармацыі ў той час ужо быў істотна абмежаваны.

1995–1996 гг. былі багатымі на палітычныя падзеі, і радыё, прэтэндуючы на ролю паўнавартаснай крыніцы інфармацыі, не абыходзіла іх сваёй увагаю. Да прыкладу, падчас правядзення вулічных акцый у інфармацыйных выпусках 101.2 заўсёды падрабязна паведамлялася пра іх ход і вынікі.

Падчас паўторных выбараў у Вярхоўны Савет 13-га склікання (канец 1995 г.) радыё разгарнула агітацыйную кампанію, заахвочваючы суграмадзян да актыўнага галасавання. Адзін з агітацыйных радыёролікаў уяўляў з сябе кароткі, але экспрэсіўны дыялог персанажаў казкі «Тры парсюкі»: *«— Ніф-Ніф, а ты схадзіў на выбары? — Не-е... — Ну і свіння ж ты!..»*

*«На рэкламным рынку мы выйшлі на першае месца ўжо перад закрыццём. Мы давалі праўдзівую інфармацыю, і рэкламныя блокі вакол нашых навін былі эфектыўнымі. Нашымі інфармацыйнымі выпускамі, паводле сацыялагічных даследаванняў, цікавіліся да васьмідзесяці працэнтаў усіх FM-слухачоў»*, — падкрэсліваў Дзмітрый Бандарэнка.

Многія сыходзяцца на думцы, што вызначальным для сумнага лёсу радыё стала з'яўленне ў эфіры тагачаснага спікера Вярхоўнага Савета 13-га склікання **Сямёна Шарэцкага**. *«Шарэцкаму тады задалі пытанне, ці ёсць у яго магчымасць выказацца яшчэ дзе-небудзь, акрамя Радыё 101.2. Ён сказаў, што іншых магчымасцяў у яго няма. Я думаю, з гэтага моманту і пайшоў адлік нашых апошніх дзён у эфіры»*, — узгадвае Жанна Літвіна.

Але, безумоўна, гэта была далёка не галоўная прычына закрыцця, падкрэслівае яна: *«Набліжаўся рэферэндум 1996 г. са зменамі ў Канстытуцыю. А ў нас пры кожнай палітычнай кампаніі прынята было прыбіраць патэнцыйна небяспечныя крыніцы інфармацыі. Мы былі якраз такой...»*



*Сяргей Лабандзіеўскі (творчы псеўданім — Серж Маркотны) у офісе на Рэвалюцыйнай, 8а*

# Закрыццё

30 жніўня 1996 г. увечары, каля 17.30, рэдакцыя Радыё 101.2 атрымала па факсе паперу з Міністэрства сувязі, падпісаную кіраўніком БелДІЭ (дзяржаўная інспекцыя па электрасувязі) А. Ніканавым: *«В целях исключения помех в приемных каналах ЦС РТС “Алтай” эксплуатацию передатчика на частоте 101.2 МГц с использованием АФС на опоре по адресу: ул. Коммунистическая, 6, прекратить с 1.09.96 г.».*

Увесь дзень 31 жніўня супрацоўнікі зачытвалі перад выпускамі навін тэкст гэтага паслання, папярэджваючы пра хуткае гвалтоўнае спыненне сваёй працы. *«Цяпер ні беларускую, ні міжнародную грамадскасць няма патрэбы пераконваць у тым, што ў нашай краіне існуюць праблемы ва ўзаемадачыненнях ўладных структураў і СМІ. Не хочацца верыць, што гэты выпадак з Радыё 101.2 з'яўляецца яшчэ адным таму пацверджаннем. Мы вельмі здзіўленыя і абураныя праяўленаю непавагаю ў першую чаргу да вас, нашых радыёслухачоў, і да ўсяго калектыву 101.2. Мы працягваем працаваць, разлічваем на вашу падтрымку і хочам, каб вы ведалі, што мы гатовыя выйсці ў эфір з папулярнымі перадачамі, абавязкова аператыўнай інфармацыяй і вашай любімай музыкай, як толькі нам гэта дазволяць»*, — гаварылася ў заяве.

Пасля спынення перадатчыка калектыў прыняў і разаслаў зварот да грамадскасці з просьбай падтрымаць Радыё 101.2 і дапамагчы высветліць сапраўдныя прычыны гвалтоўнага спынення вяшчання радыёстанцыі.

Вось яго поўны тэкст:

*«Радыё 101.2 звяртаецца да беларускай грамадскасці, дэпутатаў Вярхоўнага Савета РБ, дыпламатычнага корпусу, сродкаў масавай інфармацыі, да ўсіх прыхільнікаў радыёстанцыі з заявай... Калектыў Радыё 101.2 лічыць неабходным давесці да вашага ведама, што перадатчык Радыё 101.2 знаходзіцца на балансе дзяржаўнай арганізацыі РРТПЦ (Рэспубліканскі радыётэлевізійны перадавальны цэнтр), якая ўзяла на сябе абавязкі па яго абслугоўванні і эксплуатацыі. За перыяд існавання ў эфіры... мы не атрымалі ніводнай заўвагі і ніводнага папярэджання.*

*Варта нагадаць, што паведамленне пра выключэнне перадатчыка (гэта азначае спыненне працы радыёстанцыі) было атрымана за суткі. Зразумела, што за такі кароткі тэрмін немагчыма было зрабіць адпаведных хадоў, каб не пацярпелі інтарэсы соцень тысяч нашых слухачоў, замежных радыёстанцый “Нямецкая хваля”, “Бі-бі-сі”, “Польскае Радыё”, чые ліцэнзійныя праграмы гучалі ў нашым эфіры, дзелавых партнёраў, а таксама супрацоўнікаў Радыё 101.2, якія імгненна сталі беспрацоўнымі. Лічым неабходным звярнуць увагу і на такую сітуацыю: Радыё 101.2 — адзіная ў краіне недзяржаўная беларускамоўная станцыя, і яе дзейнасць была прыпынена менавіта ў дзень публікацыі праекта новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, напярэдадні важных грамадска-палітычных падзей у жыцці дзяржавы — правядзення рэферэндуму, давыбараў у Вярхоўны Савет і г. д. (Гл. Дадатак 1).*

*Мы расцэньваем гэты выпадак з Радыё 101.2 як чарговы наступ уладаў на свабоду слова і недзяржаўныя сродкі масавай інфармацыі, як грубае парушэнне канстытуцыйных правоў грамадзян Беларусі на атрыманне аператыўнай праўдзівай інфармацыі, як спробу выканаўчай улады абмежаваць інфармацыйнае поле краіны.*

*Мы заклікаем усіх вас не адседзецца і не прамаўчаць,*



***У «гукарэжысёрскай» Радыё 101.2 (злева направа): Кася Камоцкая, Сяргей Ахрамовіч, Вольга Бабак, Анатоль Додзь, Дзмітрый Лукашук, Ірына Курапаткіна, Алесь Дайнэка, Генадзь Кеснер***

*а праявіць салідарнасць і аб'яднаць свае магчымасці для прыпынення сваавольства і беззаконня, для абароны правоў чалавека. Мы заўсёды былі з вамі. А вы?»*

3 верасня з пратэстам супраць закрыцця радыё выступіла міжнародная арганізацыя «Рэпарцёры без межаў», 5 верасня — Літоўская асацыяцыя радыё і тэлебачання. 6 верасня дэпутат Вярхоўнага Савета **Аляксандр Дабравольскі** накіраваў прэм'ер-міністру **Міхаілу Чыгіру** запыт, у якім указвалася, што пазбаўленне ліцэнзіі радыёстанцыі супярэчыць арт. 16 Закона РБ «Аб друку і іншых СМІ», паводле якога прыпыненне альбо спыненне дзейнасці СМІ можа адбыцца па рашэнні заснавальніка альбо ў парадку грамадзянскай судавытворчасці.



***У офісе Радыё 101.2, лета 1996 г. У ніжнім шэрагу (злева направа): Вольга Бабак, Вольга Караткевіч, Ірына Курапаткіна, Алеся Верас, Іна Студзінская. У верхнім шэрагу (злева направа): Дзмітрый Бандарэнка, Алесь Хмяльніцкі, Юрась Бушлякоў, Міхаіл Князевіч, Анатоль Додзь, Алесь Ляшкевіч, Сяргей Ахрамовіч, Дзмітрый Новікаў***

Супрацоўнікі Радыё 101.2 ладзілі вулічныя пікеты, адначасова дамагаючыся адказаў у кабінетах улады. У Міністэрстве сувязі абяцалі, што эфір адновяць адразу ж пасля таго, як перадатчык будзе перанесены за горад — у Калодзішчы. Чыноўнікі ўскосна пацвярджалі, што не маюць да Радыё ніякіх прэтэнзій, і намякалі, што адказаў на ўсе пытанні адносна лёсу станцыі трэба шукаць «вышэй».

І сапраўды, у хуткім часе такі адказ прагучаў з самага «верху». **Аляксандр Лукашэнка** 21 верасня 1996 г. на рэспубліканскім Форуме Моладзі, адказваючы на зададзенае з залы пытанне наконт прычыны закрыцця радыёстанцыі, заявіў літаральна наступнае: *«Ні 101.2, ні іншым антыдзяржаўную палітыку праводзіць на дзяржаўнай частаце за дзяржаўныя грошы дазволена не будзе... А за грошы сорасаў і іншых у нас хапае гадасцяў і так на дзяржаўным радыё і тэлебачанні...»*

Страта надзеі на вяртанне ў эфір супрацоўнікам «стоадзінкі» далася, безумоўна, балюча.

Тым не менш без працы яны не засталіся. У тым жа 1996 г. у студыі Радыё 101.2 пачалі запісваць «Народны альбом». Частка журналістаў рабіла праграму для Радыё «Свабода» — «Новае пакаленне выбірае». Частка працавала на Беларускую рэдакцыю Польскага радыё, якая ў хуткім часе пачала аддаваць паўгадзіны свайго эфіру штодня для Радыё 101.2. У 1999 г. адкрылася Радыё «Рацыя».

Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

Пра Радыё 101.2, якое праіснавала ў эфіры ўсяго год, сказана нямала гучных словаў: «прэцэдэнт у гісторыі Беларусі», «цалкам беларуская, незалежная, прафесійная прастора», «нябачная, але чутная мадэль Беларусі, якая мусіць быць»...

Але найпрасцей сфармуляваў памкненні тагачасных «стоадзінаўцаў» дырэктар радыёстанцыі Дзмітрый Новікаў: *«Наша грамадства спаралізаванае савецкімі комплексамі і стэрэатыпамі. Найперш: беларускае — горш за расійскае. Мы зламалі гэты стэрэатып... Таму нас і зачынілі, бо спужаліся развіцця — незалежнасці ў галовах».*

***Фота з асабістых архіваў***



*Виктория*
*РАВИНСКАЯ*

# Если б я умела молиться…

## Я бы помолилась за ЭТУ революцию и за то, чтобы ее результаты никогда не канули бесследно в Лету

**В Киеве (вовсе не утверждаю, что только в Киеве, но слышать это в столице «братняй Украіны» приходилось на каждом шагу) Оранжевую революцию называют Революцией. Вот так — с большой буквы. И без окраски.**

У них там, в Киеве и не только, есть такой Рубикон — до и после Революции. Той самой Революции, что дала возможность людям почувствовать себя Гражданами, от которых зависит будущее страны и которых невозможно отныне обдурить и сделать безликим электоратом.

### А теперь о молитвах

Молиться я не умею. Как-то так случилось, что покрестилась я, будучи человеком довольно, по теперешним меркам, больших лет. Обычно крестят в младенчестве.

Почему вообще? Мама почему-то настояла. А для «храбрости» моей подговорила и брата. Крестились вместе 7 апреля, в Вербное Воскресенье. Свеча у меня все время гасла. Поп даже пошутил, что, мол, заодно беса изгоняем…

Я это к чему: «номинальное» крещение со свидетельством, где сначала церковный служка автоматически почему-то поставил цифру 13 (эта «дьявольская» метка зачеркнута и исправлена на семерку), мне божественного исступления не явило. Молиться я не научилась, молитв не изучила и в церкви после того была раза два исключительно по делам службы (журналистской, конечно). И до сего момента о бренности бытия не задумывалась.

А тут вдруг проняло меня.

Захотелось молиться. Точно знаю, за что. За то, чтобы в Украине не стало хуже. Потому что страшно мне представить, что у них молоденькие, зелененькие, такие нежные и нуждающиеся в заботе и защите ростки демократии вдруг будут затоптаны… нет, просто изничтожены «катком» новой власти.

Все мои нынешние несостоявшиеся молитвы навеяны общением с киевлянами. С гидом, что рассказывает об истории киевского



Подола, и родственниками, людьми, которых я до последнего времени считала по-белорусски аполитичными.

### Оранжевый Подол

Жара под тридцать. Киевский Подол и наша замечательная гид Влада… Да, очень интересно слушать, как тут все время от времени горело, как католическому ксендзу при набеге врагов явилась Богородица и потребовала нести ее мраморное изваяние. Он понес, аки перышко, — столь огромной была ее сила… Но самым страшным нашествием для Подола, для всего Киева, впрочем, как

и для всей Украины, стали большевики. Громили церкви, убивали священнослужителей… Ой, да только ли священнослужителей!

Когда Союз распался, украинцы стали восстанавливать утраченное. Причем начали с языка. Потому, наверное, все остальное восстанавливалось быстрее, чем у нас.

Все время блуждания вокруг Контрактовой площади я пыталась объяснить себе, почему мне так комфортно в Киеве и так, мягко говоря, некомфортно на родине, в ее столице — Минске. Ну вот хотя бы первый вопрос гида к нам: «Язык какой — русский, английский или украинский?» Русский. Она говорила на грамотном русском с волшебным украинским акцентом. Но, если ей звонили по мобильному, тут же переходила на украинский. Завидки берут. Правда. Я пыталась в своей не очень далекой от столицы провинции найти курсы разговорного белорусского. Представляете результат моих поисков?

…Все исторические новеллы от Влады были очень познавательны. Но самое интересное началось тогда, когда наша замечательная гид решила дать нам передохнуть от солнца и посадила в тенечек на каких-то ступенях. И начала рассказывать о Революции. Да, той самой, которую мы привыкли называть Оранжевой.

Во время всего повествования у меня стоял ком в горле. И объяснить себе эту слезливость я не могу по сей день. Точно такие же слезы у меня вызывает книга «Верым! Можам! Пераможам!», которую я время от времени перечитываю, чтобы не расслабляться.

Почему у нас не получилось, а у украинцев получилось? Стояли они почти месяц на Майдане Незалежнасти при ужасной погоде. Но вот у них стояли десятки тысяч, а у нас — пару сотен и три дня…

Когда 19 марта 2006 года мы редакцией собирались ехать на Октябрьскую площадь, было полное ощущение, что едем умирать. Разговоров в машине почти не было — каждый прощался со своим самым дорогим. Готовы были ко всему. Чего боялись? ОМОНа, который привык исполнять любые приказы.

Так вот. В Украине такого ОМОНа белорусского образца просто не было и, дай Бог, не будет впредь. Достаточно посмотреть на милиционеров на киевских улицах. Никакой спеси, превосходства над... и презрения к… Люди «работу работают»: охраняют спокойствие граждан.

И во время Революции украинским омоновцам можно было повесить на щит красную гвоздику. Повесьте нашим… если живым доберетесь до этих «черных стенок». Понятно, что приказов на уничтожение украинским омоновцам не давали. Потому что в Украине это трудно себе представить. Но вот только я все время думаю: а сойди Кучма с ума и дай такой приказ, много бы нашлось тех, кто пошел бы убивать свой народ? Почему у нас находятся такие, кто без зазрения совести избивает безоружных и беззащитных?



*Истина от Влады.*
*Белорусские журналисты в столице Украины*

…Позволю себе отвлечься, чтобы попытаться ответить на это «почему?». Летом государственные СМИ радостно трещат о «белорусском достижении» — патриотических лагерях. Собирают детей (по большей части так называемых «неблагополучных», уже имеющих «трения» с законом) в лагеря на базе воинских частей и перевоспитывают: прививают воинскую дисциплину (лечь-встать, стоять-сидеть), дают в руки оружие (!), в общем, натаскивают, уверенные в том, что уж после такой-то «школы» они обязательно перевоспитаются и будут исполнять приказы беспрекословно. Заметьте, не какими-то гуманитарными программами «лечат», а приучают исполнять приказы. Словно любовь к родине состоит только из «верно» направленной ненависти и способности не обсуждать любые приказания, а их незамедлительно исполнять…

Для всех революционеров киевский Майдан стал, наверное, самым памятным периодом в жизни: люди боролись за свою свободу, за свободу своей страны, за право называться гражданином Украины. Чуть не в легенду превратился рассказ о том, как киевляне позвонили в штаб Революции и предложили свою квартиру для ночевки семи мужчинам с Майдана (жители украинской столицы тогда предоставляли революционерам жилье, питание, всячески заботились о митингующих). Семерка эта нашлась сразу: ночевать на морозе было трудно. Около полуночи приехали по указанному адресу, позвонили в дверь, сказали, что с Майдана. Их накормили, дали возможность помыться, уложили спать… Утром семерка уехала на Майдан.

Чуть позже в штабе раздался звонок. Звонила семья, которая приглашала семерых майданщиков: «Что случилось? Почему не приехали? Или их «забрали»?» Оказалось, что мужчины просто ошиблись подъездом и зашли в случайную квартиру.

## Свобода по-киевски

— У нас сейчас стало жить хуже, — рассказывала мне «тетя» Инна (мы с ней почти ровесницы, потому и закавычиваю «тетю»). Дядюшка только скорбно кивал головой. — У нас при Ющенко была демократия. А теперь… Все к тому идет, что будет как у вас в Беларуси.

Резануло ухо «у вас в Беларуси». Дядя мой белорус. Инна — тоже. Уже более двух десятков лет живут в Киеве. Еще десять лет назад они говорили: «у нас в Беларуси». Теперь уже отрезало. Назад они не вернутся. Не выживут. Надышались свободой. Киевской. Когда я слышу из телеагитатора, что свобода белорусам не нужна, потому что она есть, мне вспоминаются киевские родственники.

Спрашивала у родственников, были ли фальсификации на последних выборах. Смотрят удивленно: «После Революции? Кто ж бы решился! Наверное, погрешности только какие-нибудь».

В 2002 году я была международным наблюдателем на парламентских выборах в Украине. Нас отправили в Запорожье. «Убил» меня тогда один случай на избирательном участке. Народу — валом, кабинок не хватает, люди, развернув метровые бюллетени (столько было зарегистрировано партий на выборы), ставят подписи прямо на коленях. Подходим к комиссии. Кстати, замечу, на каждого члена комиссии приходилось трое наблюдателей, которые следили из-за их спин, правильно ли выдаются бюллетени (немыслимо в Беларуси!). Нарушение — налицо: избиратели лишены возможности зайти в кабину и проголосовать тайно.

Председатель комиссии, посмотрев мельком в наши удостоверения, спрашивает: «А вы, извините, из какой страны?» Мы гордо отвечаем: «Из Беларуси». Председатель саркастически улыбается: «Вы бы сначала у себя научились выборы проводить, а потом нам бы замечания делали». У меня от стыда запылали уши! Весь мир, выходит, знал: тогда только что, года не прошло, белорусы согласились с явными фальсификациями на своих главных выборах!..

Инна жаловалась: «Ну, у нас теперь… Янукович начал вести себя как… как ваш. Уже, понимаешь, собирается Пятый канал закрывать. (В Украине Пятый канал считается самым острым и при этом объективным.) И за что? Только за то, что показали, как на президента грохнулся венок на встрече с Медведевым. Показали, невзирая на негласный запрет. Ни один канал не решился, а они показали. Да Ющенко за все время, сколько у власти был, ни разу никого не закрыл, никому из журналистов упрека не высказал. Свобода слова — значит, свобода слова! А ведь поливали его сколько! И за дело, конечно, но мы уже отвыкли, что президент может давить на прессу, врать журналистам или же прилюдно их ругать и пугать».

Да и кроме «неющенковского» отношения к прессе есть претензии к новой власти: «Ющенко как на работу ездил? Никто ведь и не замечал его передвижений по Киеву. Как все! А теперь вот я на работу езжу по той дороге, по которой Янукович из своей резиденции каждое утро выезжает. Час можно стоять и ждать, пока его величество проследуют. Цаца какая! «Проф-фесор»!» (О «проффесоре»: это так Янукович в какой-то анкете свое звание научное записал. Смеху было в Украине! Правда, теперь уже в газетах этого не прочитаешь.)

Популистские обещания поднять экономику пока тоже не выполняются. «Ему некогда, — смеялась Инна. — Он же занят теперь. Ему ж надо с

Россией целоваться и делать все наперекор предыдущему президенту!»

«Так почему же все-таки Янукович у власти оказался?» — спрашивала я и у родственников, и у революционерки-гида. Внятного ответа не услышала. «Так не Киев же его избирал, восток наш русскоязычный... Да ведь и перевес в какие единичные проценты!» «А что ж за Ющенко снова не голосовали, ведь так у вас свободно дышать стало при нем?» — не унималась я. «Не повезло ему — кризис гакнул. Не у нас ведь только — мировой. А вот начали связывать кризис именно с ним... Вот и не поддержали. А потом мы уж за Тимошенко голосовали, только чтобы не за Януковича... Это еще сколько он натворить может, у него ж срок только начался! Его уже сейчас украинским Лукашенко называют!»



## Может, и не молитва, но...

И все же это скорее страшилки. Не выживет там уже авторитаризм. Во-первых, потому, что слишком много частников. А этим людям есть за что бороться, они своего кровного на поддержку диктатуры не дадут, хоть ты их миллионом указов засыпь. Пойдут свою собственность защищать — вне сомнения.

А во-вторых, есть опыт Революции. «У нас сейчас в Киеве, — рассказывала гид не без гордости, — собраться людям — три минуты! Интернет же есть. Студенты — молодцы, если что — сразу на улицу. Правда, при Януковиче что-то их уже разгонять пробуют. Пока мягко. Ну а будет жестче — так и мы все подтянемся, вспомним Майдан».

Однако новой революции никто не хочет. Майдан, конечно, лучшие воспоминания. Но было это не так романтично и весело, как кажется по прошествии лет. «Холодища же была, жуть, — вспоминала наша гид. — Мокрый снег, сырость, люди болели, мерзли... Сутками на улице! Если кто скажет, что мы за деньги стояли, — не верьте. Я на Майдане заработала только простуду и радикулит. Но нисколько не жалею, что была наша Революция. Не зря, потому что была. Ну а Янукович... Посмотрим, а потом переизберем! Вот вы-то как, соседи? Не справляетесь сами, нас зовите — что-нибудь придумаем».

На том и расстались. И отправились домой, туда, где толпами ходят мрачные милиционеры с дубинами и наручниками, где люди не улыбаются на улицах, где за бело-красно-белое сочетание можно в кутузку загреметь... Где скоро грядет «главное политическое событие» — президентские выборы. Что-то после них будет? Знаем все и все же, вопреки ожидаемому, надеемся на оптимистический исход.

А молиться за Беларусь я пока не хочу. Время для молитв еще не настало. Сейчас у нас другим заниматься надо. Сами знаете, чем. А уж потом, даст Бог, помолимся.

*«Брестский курьер», www.bk-brest.by*

# «Информ-прогулка» без прогулов




**В конце июля вышел в свет 600-й номер лунинецкого еженедельника «Информ-прогулка». Это издание массово-политическое и для досуга. Выходит с 1 марта 1994 года.**

**Об истории газеты и ее нынешнем житье-бытье мы беседуем с учредителем и главным редактором Андреем ВЫШИНСКИМ.**

— *Скажи, Андрей, а как появилась идея создать собственную газету?*

— Девяностые годы были временем устремлений, эпохой нового, неизведанного. И хотя я в ту пору редактировал районную газету «Ленінскі шлях», затем переименованную в «Лунінецкія навіны», желание основать собственное издание было. Да и как гражданин Беларуси я по закону имел на это право. И в августе 1993 года зарегистрировал «Информ-прогулку».

— *А почему именно такое название?*

— В то время очень популярным был петербургский дайджест «24 часа». Вот по аналогии и создавалось издание. Это был дайджест наиболее интересных публикаций других СМИ. Однако в той или иной степени в газете с самого начала присутствовали и авторские материалы местных журналистов, отдельные специальные выпуски были посвящены лунинецким предприятиям и организациям, а также проблемам местного самоуправления в Беларуси и странах Европы. Газета выходила тогда два раза в месяц, тираж составлял от 500 до 10 000 экземпляров, частично реализовывался в других регионах Беларуси и в Украине.

— *Что же было дальше?*

— В 1994 году я ушел с должности главного редактора районки и сконцентрировался на издательской и полиграфической деятельности. Новый импульс получила и газета. К середине 1999 года вместе с группой лунинецких журналистов и активных авторов мы приняли решение перейти к еженедельному выпуску и сконцентрироваться на местной тематике. Свою роль сыграло и то, что несколько журналистов были уволены тогдашним руководством государственной районной газеты и фактически остались без работы, а многие авторы демократических взглядов были лишены возможности печататься в официальной местной газете.

*— Андрей, можно немного статистики?*

— Конечно. К осени 2007 года вышло 450 номеров. Если в середине 1999 года тираж составлял около 1 000 экземпляров, то к 2005 году достиг 8 500. Объем газеты вырос за это время с 4 до 20 полос формата А3, а со второго полугодия 2007 года газета выходит на 24 полосах. Сейчас из этого количества страниц четыре полосы полноцветные, остальные — черно-белые.

*— Трудности были?*

— А когда их не бывает? К примеру, в начале 2006 года, во время предвыборной президентской кампании, местное руководство запретило продавать «Информ-прогулку» в государственных магазинах. Тогда была создана альтернативная служба доставки и распространения газеты. К тому же часть тиража реализуется через ведомственные и частные торговые точки, киоски «Белсоюзпечати», еще сохраняется и подписка через почтовые отделения системы «Белпочта». В итоге тираж в новых неблагоприятных условиях снизился незначительно. Сейчас он составляет 7 500–8 000 экземпляров.

*— Какие еще были препятствия на вашем пути?*

— Вот такая ситуация. С 1 января 2008 года индивидуальных предпринимателей поставили в жесткие рамки. Они имели право принимать на работу только родственников. Тогда я создал частное унитарное предприятие «Информ-прогулка». Соответственно увеличились расходы. Тем не менее материальные трудности не помешали сформироваться достаточно сплоченному и квалифицированному коллективу редакции, с которым сотрудничают и многие внештатные авторы. Журналистам приходится заниматься не только творческой деятельностью, но и организационно-техническими проблемами, включая доставку газеты из типографии в городе Пинске, ее распространение по торговым точкам и т. д. Сильное подспорье в работе редакции — читательская солидарность с газетой.

*— А какова структура издания?*

— Из 24 полос формата А3 сейчас половину занимают программы 28 каналов телевидения, реклама, частные объявления и поздравления. Остальные 10 полос охватывают широкий тематический спектр. Общее число рубрик превышает 30.

*— Что же привлекает читателя?*

— О жизни региона во всех ее проявлениях рассказывают рубрики «Лента новостей», «Местные новости», тематическая полоса «В Микашевичах». В каждом номере публикуются данные о местных жителях, которые родились, вступили в брак или, как это ни печально, умерли. Регулярно анализируются экономические реалии региона. Кроме того, постоянно публикуются материалы, посвященные ситуации на отдельных предприятиях, в жилищно-коммунальной сфере и т. п. Читательским письмам и обращениям посвящены рубрики «Строки из конверта» и «Вопрос — ответ». Регулярно публикуются мнения жителей по актуальным темам под рубрикой «Поговорим».

Редакция стремится привлекать для консультаций по интересующим читателей проблемам специалистов различных отраслей (юристов, медиков, коммунальных работников и т. д.). Тематическая рубрика «Суд да дело» посвящена процессам в местных судах, «Кримобоз» — милицейской хронике происшествий и преступности, «Иммунитет» — вопросам здравоохранения, «Тет-а-тет» — молодежным проблемам, «Педагогическая гостиная» — сфере образования, «Автомото» — проблемам, имеющимся у владельцев автомашин, «Семейный КЛУБок» — вопросам семьи и семейным отношениям.

*— Известно, что региональные газеты востребованы. Но какие-то рубрики притягивают больше...*

— Рубрика «Знакомые лица» представляет интервью с интересными собеседниками, в основном из числа жителей региона. Тематическая полоса отводится новостям спорта — местного и мирового. Популярна детская рубрика «Чунга-чанга». Юмор, сканворды и другие головоломки для эрудитов, материалы для досуга, читательские фотоконкурсы (вообще различные конкурсы и викторины проводятся постоянно, по итогам среди читателей разыгрываются призы) на страницах газеты появляются с завидной регулярностью. Популярностью пользуется рубрика «Житейские истории», где печатаются очерки и рассказы на различные темы. Рубрика «Народный лечебник» посвящена нетрадиционной медицине. Есть литературная рубрика, регулярно печатаются материалы на краеведческие и исторические темы. Что касается культурной тематики, то кроме постоянного ее освещения газета по возможности сама принимает участие в проведении различных мероприятий (фестивали, конкурсы красоты, литературные вечера в школах, встречи с читателями и т. д.).

*— А политику как-то затрагиваете?*

— Несомненно. Без этого нет жизни. Ибо жизнь — та же политика. Что касается внешней политики, то она представлена, во-первых, в рубрике «В фокусе внимания», ведущий которой еженедельно освещает происходящие в мире и в Беларуси события. Примыкает к ней и популярная у читателей рубрика «Посредник», в которой дается краткая подборка фактов за неделю, сгруппированная по разделам — Беларусь, страны СНГ, весь мир. Причем эта рубрика — не просто «механический» дайджест, ее ведущий нередко кратко комментирует то или иное событие.

*— С общественными организациями поддерживаете связь?*

— Без этого также газета не может существовать. Большинство сотрудников редакции и ряд внештатных авторов являются членами ОО «Белорусская ассоциация журналистов», принимают участие в ее мероприятиях, семинарах и конференциях. Журналисты поддерживают тесные контакты, проводят совместные мероприятия и с рядом других общественных объединений (например, с Белорусской организацией трудящихся женщин, творческим клубом «Муза», центром «Молодежь Лунинетчины» и др.). В какой-то степени газета и сама является «общественным объединением», поскольку сплачивает вокруг себя многих творческих, инициативных, небезраличных людей.

*— Знаю, что ты человек, который не стоит на месте. Какие новые шаги сделаны в последние годы?*

— Не стоять на месте заставляет жизнь. Когда была угроза приостановки выхода «Информ-прогулки», смогли зарегистрировать газету «Вита-Пресс». Сделали ее дополнением к основному изданию. Сейчас настало время этой цветной восьмиполоске формата А4 стать полноценной региональной газетой. С 5 августа начинаем новый проект. Газета «Вита-Пресс» будет выходить как столинский еженедельник с полноцветными, двухцветными и черно-белыми полосами.

И еще. В августе прошлого года зарегистрировали ежемесячник «Газета па-лунінецку».

*— Успехов тебе и вашему коллективу.*

— Спасибо.

***С коллегой общался***
***Николай АЛЕКСАНДРОВ***



# Вось яна якая, жанчына глянца!



*Марына*
*КАСТЫЛЯНЧАНКА*

**Прыгледземся больш пільна да беларускіх жанчын, якія чытаюць глянец. Некаторыя з іх аддаюць перавагу расійскай версіі амерыканскага часопіса «Cosmopolitan», іншыя выбіраюць «Женский журнал» айчыннай вытворчасці. Чым адрозніваюцца гэтыя жанчыны, і ў чым яны падобныя?**

Жанчыне Cosmo 20–30 гадоў. Чытачка ЖЖ — яе аднагодка, можа, крыху старэйшая. Абедзве могуць быць хатнімі гаспадынямі альбо працаваць, але ў кожнай знойдуцца грошы на набыццё і час на чытанне ўлюбёнага выдання. Варта адзначыць, што апошняга — часу — павінна быць з лішкам.

Хутчэй за ўсё, ніводная з іх не з’яўляецца бізнес-лэдзі, хоць, напэўна, марыць ёю стаць. Пры гэтым відавочна, што першая больш забяспечаная за другую. А можа, проста менш патрыятычная?

Магчыма, кожная з іх замужам, або збіраецца стаць жонкай, або жыве ў «грамадзянскім шлюбе», а можа, ужо ў разводзе. У любым выпадку кожная верыць у сваё жаночае шчасце, якое абавязкова прыйдзе, — і чытае. Аматарка Cosmo — гісторыі з жыцця папулярных галівудскіх зорак, расійскіх знакамітасцяў, звычайных людзей. Тая, што выбірае ЖЖ, рэдка сустракае на старонках любімага глянца замежных прадстаўнікоў шоўбізнесу і кінаіндустрыі, а ўсё часцей — вядомых суайчынніц. Аднак непазбежныя і жыццёвыя гісторыі, героям якіх яна часам зайздросціць, часам спачувае.

Абедзве, незалежна ад сямейнага статусу, актыўна паглынаюць інфармацыю па псіхалогіі ўзаемадачыненняў паміж мужчынамі і жанчынамі, пры гэтым нямала ўвагі надаецца

назапашванню сексуальнага досведу. Яны могуць адкрыта гаварыць пра секс, пра розныя навінкі і праблемы, з ім звязаныя. Могуць задаваць пытанні псіхолагам і ўголас распавядаць пра «інтым». Забароненых тэм больш няма! Вось толькі ці выкарыстоўваюцца веды на практыцы?

Міс Cosmo сочыць за прыгажосцю і здароўем. Пры ўсёй стройнасці фігуры яна ўсё ж ведае некалькі дыет і комплексаў фізічных практыкаванняў і нярэдка імі карыстаецца.

Здароўе скуры, валасоў і пазногцяў — асобная размова. Падчас выбару касметыкі жанчына Cosmo арыентуецца на заходнія кампаніі: Chanel, L'oreal, Maybelline і інш. Рэклама ва ўлюбёным глянцы не пакідае абыякавай, і таму можна адзначыць разнастайнасць цюбікаў і слоічкаў у ваннай. Крэмы, што маладзяць, увільгатняюць, танізуюць, маскіруюць недахопы скуры. Усяго не пералічыць. Можна адкрыць касметычны салон дома.

Вельмі беражліва ставячыся да здароўя, у выхадныя яна ўсё ж не супраць расслабіцца, выпіць келіх-другі Bacardi або Martini і закурыць Kiss, Capri або Glamour.

Міс ЖЖ старанна сочыць за сабой, але ў яе арсенале не так шмат слоічкаў. Гэта, аднак, не перашкаджае ёй выглядаць выдатна. Яна аддае перавагу беларускім вытворцам. Але ў яе касметычцы ўсё ж можна натрапіць на дасягненні заходняй цывілізацыі. Яна таксама практыкуе фізічныя нагрузкі і дыеты, актыўныя формы адпачынку.

Міс Cosmo актыўна цікавіцца навінкамі моды, жанчына ЖЖ — не адстае. Аднак варта заўважыць, што першая аддае перавагу адзенню ад вядомых брэндаў: Guess, Levi's, Intimissi, Trussardi і г. д. Другая выбірае «зробленае ў Беларусі», але і ў модным буціку яе можна сустрэць.

Інтарэсы лэдзі ЖЖ разнастайныя: музыка, выставы, кнігі, кіно, канцэрты.

Яе рэдка сустрэнеш на дыскатэцы або ў бары, таму што нямала часу яна аддае ўладкаванню дома. Яна можа рабіць цуды на кухні, здзіўляючы блізкіх новымі стравамі. Але пры ўмове дастатковай колькасці вольнага часу, наяўнасці неабходнай сумы на закупку экзатычных інгрэдыентаў і, несумненна, жадання.

І, вядома, дзеці! Маленькая асоба з яе поспехамі і няўдачамі, радасцямі і бедамі, няўхільным сталеннем прэтэндуе на нейкую частку ўвагі.

Падарожжы ў іншыя краіны, хаця б і па старонках часопіса, захапляюць яе. Незвычайнасць Усходу, традыцыі і абрады нябачаных астравоў, своеасаблівая прыгажосць еўрапейскіх ландшафтаў... Часопісныя «вандроўкі» дазваляюць папоўніць веды па геаграфіі, рэлігіязнаўстве, па архітэктуры і культуры розных краін. Але яна таксама актыўна цікавіцца беларускімі гісторыяй і міфалогіяй.

Кар'ера мала яе займае, яна хутчэй бачыць сябе стваральніцай і ахоўніцай сямейнага ачага.

А вось лэдзі Cosmo ў захапленні ад шумных вечарынак і разнастайных тусовак. Яна не ўяўляе ўласнае жыццё без блокбастэраў і бестселераў, якія прыносяць мільёны сваім стваральнікам. Дома Cosmo-лэдзі бывае рэдка, і дзеці пакуль не ўваходзяць у яе планы. Замест гэтага яна не супраць пабываць у розных краінах, акунуцца ў іх шматстайнасць і своеасаблівасць, завесці курортны раман і прывезці сувеніры блізкім.

Сваю паспяховасць у жыцці яна звязвае з кар'ерай, але пакуль далей за падрыхтоўку да сумоўя, вывучэнне псіхалогіі наймальніка і правілаў паводзінаў з начальствам справа не ідзе. Час для рашучых дзеянняў яшчэ не надышоў.

Сучасную жанчыну часта можна ўбачыць за рулём аўто. І калі чытачка Cosmo ведае прыёмы контраварыйнага ваджэння і розныя віды паліва, няхай толькі ў тэорыі, то прыхільніца ЖЖ знаёміцца з вуліцамі горада — але не з іх месцазнаходжаннем, а з кароткай біяграфіяй чалавека, у гонар якога вуліца была названая.

І, як большасць жанчын, абедзве вераць у астрапрагнозы, любяць праверыць свой узровень у якой-небудзь галіне з дапамогай нескладанага тэсту, а на «дэсерт» прачытаць караценькае апавяданне, некалькі анекдотаў і разгадаць немудрагелісты сканворд.

Хоць прыхільніцы Cosmo і ЖЖ маюць шмат адрозненняў, ёсць найбольш выразная рыса, якая іх аб'ядноўвае, — цяжка ўявіць любую з іх за чытаннем чагосьці больш сур'ёзнага, чым глянцавы часопіс.

Але застаецца надзея, што рана ці позна, насыціўшыся аднастайнымі артыкуламі і бясконцай рэкламай, жанчына глянца пройдзе міма стракатай вокладкі любімага выдання і спыніць свой позірк на непрыкметнай, без малюнкаў, кнізе якога-небудзь сур'ёзнага аўтара.



*Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ*

# Два погляды

## Культурніцкія падзеі ў электронных версіях «Нашай нівы» і «Беларусь сегодня»

Даўно вядома, што адна рэч — гэта кніга, а другая — рэцэнзія на яе, адна рэч — спектакль, і іншая — зацемка пра спектакль. Хоць і праз рэцэнзіі ды іншы пераказ мажлівасць пазнаёміцца з апошнімі фільмамі, спектаклямі, літаратурнымі ці музычнымі навінкамі ў вас, безумоўна, ёсць. Напрыклад, праз інтэрнэт-выданні «Беларусь сегодня» і «Наша Ніва». Пагатоў, абодва выданні карыстаюцца ў сеціве амаль аднолькавай увагай.

Для пачатку выдатным узорам будзе параўнанне рэцэнзій на фільм Ціма Бёртана «Аліса ў краіне цудаў». Гэта рэдкі выпадак, калі абодва выданні пішуць пра адну і тую ж падзею. У артыкуле ад 11 сакавіка **«Беларусь сегодня»** прапануе чытачам эмацыйную тыраду аглядальніка Д. Кляўіцкага пад назвай «Чайная паўза». Аўтар адразу ж уводзіць чытача ў курс справы і паведамляе, што ў фільме «*оформившуюся девицу* (Алісу. — *Аўт.*) *планируется выдать замуж за противного лорда, страдающего расстройствами желудка...*». А «*по поводу последнего актера* (Джоні Дэпа. — *Аўт.*) *давно пора распустить слух, что он погиб в какой-нибудь дурацкой автокатастрофе... и теперь на съемки доставляют его бальзамированное тело, которое работает благодаря электричеству, черной магии, тяжелым наркотикам и компьютерным эффектам...*». І, нарэшце, чытачу рэцэнзіі аўтар прапануе задумацца адносна таго, ці варта яму глядзець фільм: «*Что касается спецэффектов... то они могут окончательно удовлетворить только две категории зрителей: тех, у кого ампутировано воображение, и тех, кто умудрился не познакомиться с книгой*».

«Мармазяўр ідзе!» («Бармаглот» паводле Л. Кэрала. — *Аўт.*) — такой пацешнай назвай заваблівае чытача Л. Кавальчык з **«Нашай Нівы»**. З першых жа словаў аўтар з захапленнем паведамляе чытачу пра дзівосны фільм Ціма Бёртана: «*Ці не самы паспяховы дзівак Галівуда зняў казку для дзяцей*». А пасля яе заўвагі: «*Замест малой і крыху нуднаватай кэралаўскай Алісы — 20-гадовая бунтаўніца...*» — з'яўляецца жаданне хутчэй бегчы ў найбліжэйшы кінатэатр. «*У Бёртана... Аліса падобная хутчэй да Жанны Д'Арк*», — інтрыгуе Л. Кавальчык.

Відавочна, **«СБ»** фільм не спадабаўся, а **«НН»** ад яго амаль у захапленні. І ўсё ж, што **«Беларусь сегодня»** раіць сваім чытачам? Мяркуючы па публікацыях, — такія сучасныя касавыя стужкі, як «Кніга Ілая», «Выспа праклятых», «Аватар». У выданні анонсы лёгкага забаўляльнага кіно і меладрамаў: «Душэўная кухня», «Шэры», «Мілыя косці», сталая ўвага — да расійскіх серыялаў, трылераў і камедый: «Школа», «Наша Russia. Яйкі лёсу», «Кандагар». З беларускіх кінематаграфічных праектаў ад пачатку года да сярэдзіны сакавіка патрапілі пад увагу толькі два — серыял В. Сікоры «Трэці званок» і фільм М. Носава «Каін».

А **«Наша ніва»**? Для яе, як выглядае, істотнае значэнне маюць не столькі мастацкія вартасці кінастужак, колькі ўдзел беларускіх майстроў у розных праектах ды пошук родных каранёў у творчасці замежных кінематаграфістаў. А. Курэйчык піша, напрыклад, сцэнар «Новы год крочыць па краіне» для студыі «Базілеўс» (Расія), галівудскі блокбастэр «Дарога дадому» распавядае пра неверагодны лёс беларуса з Глыбоччыны. Кшталту — ведай нашых! Ці «нашы» не толькі ў расійскім кінематографе, але і ў Галівудзе. І гэта, відаць, крута.

З іншых кінападзеяў **«НН»** абмяркоўвае цырымонію ўручэння «Оскара», навіны Берлінскага кінафэсту, не абмінае нашумелы «Аватар» і найлепшы фільм года «Уладар буры». Чытач даведаецца, што ў хуткім часе рэжысёр

Наша Ніва

Купалаўскага тэатра М. Пінігін будзе здымаць стужку «Каласы пад сярпом тваім» паводле У. Караткевіча, што 15 лютага ў кінатэатры «Піонер» адбыўся прагляд фільма А. Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі», які быў пад забаронай у Беларусі амаль 6 гадоў... Кагосьці зацікавіць зацемка пра дакументальны фільм Л. Клінцовай «Шпіён з-пад Вілейкі», які дэманстраваўся на ОНТ і прысвечаны неардынарнай асобе Янкі Філістовіча. А хтосьці, прачытаўшы анонс, пажадае прагледзець стужку «ІзГоі», знятую тэлежурналістам А. Ступнікавым для канала Белсат.

А якія літаратурныя творы і падзеі трапілі ў поле зроку гэтых выданняў?

Ад пачатку года да 14 сакавіка **«СБ»** прапанавала чытачам 11 кніг. Гэта «Янкаў вянок» У. Ліпскага, «Юльюш Славацкі» У. Ліхадзедава, «Анёлак і я» Л. Дранько-Майсюка, «Белорусские сокровища за рубежом» А. Мальдзіса, «Я хацеў бы спаткацца з вамі...» — успаміны пра М. Багдановіча. Астатнія — творы класікаў замежжа (Оскар Уайльд, Сальвадор Далі, Артур Конан Дойл, Айрыс Мэрдак) і сучасная расійская літаратура («Журавли и карлики» Л. Юзефовіча, «Логово льва» В. Аксёнава).

**«Наша Ніва»** прэзентуе значна болей твораў, але аддае перавагу кнігам, звязаным з гісторыяй Беларусі і ВКЛ: «Гісторыя беларускай кнігі. Кніжная культура Вялікага княства Літоўскага» М. Нікалаева, анталогія «Тысяча гадоў добраму суседству», прысвечаная беларуска-літоўскім культурным і гістарычным сувязям (складальнік С. Панізнік). «Белорусские сокровища за рубежом» А. Мальдзіса — адзіная кніга, прааансаваная абодвума выданнямі. Газета звяртае ўвагу чытачоў на творы найбліжэйшых суседзяў з Польшчы і Літвы: паэма «Міндоўг, кароль літоўскі» польскага паэта Ю. Славацкага ды інш.

У выданні распавядаецца не толькі пра выхад новых кніг, але і пра іншыя падзеі, звязаныя з беларускай літаратурай. З нагоды 75-годдзя паэта Р. Барадуліна **«НН»** друкуе ягоныя ўспаміны пра У. Караткевіча, Л. Баразну і Р. Бярозкіна, прапануе наведаць шэраг тэматычных мерапрыемстваў: кніжную выставу, імпрэзу з нагоды 70-годдзя Л. Дайнекі ў Чырвоным касцёле, вечарыны, прысвечаныя В. Тарасу, І. Навуменку, Л. Геніюш.

Часам падаецца, што **«Наша Ніва»** імкнецца ахапіць неабсяжнае. «Як напісаць раман» — распавядае аўтар трылераў і гістарычных дэтэктываў М. Клімковіч, «код Ван Гога» спрабуе расшыфраваць у сваёй кнізе «Бювер» мастак і літаратар У. Сіўчыкаў. Анансуецца шмат разнастайных выданняў на розны густ: зборнік памяці літаратуразнаўцы Г. Кісялёва і выніковая кніга конкурсу маладых літаратараў «Святая праўда ды іншыя казкі», чарговыя нумары беларускіх часопісаў «Дзеяслоў», «ПрайдзіСвет», «Верасень», «Маладосць», альманахі «Дзеды», ARCHE. У **«НН»** друкуюцца лепшыя беларускамоўныя вершы з пошты рэдакцыі («Спадзяванне», «У завіруху» А. Сакалова). Зацікаўленыя азнаёмяцца не толькі з прозай, вершамі і эсэямі маладых аўтараў (М. Роўда, Ю. Шадзько, А. Мартынчук, анонс кнігі Д. Ліс «Высновы Jazz»), але і з творамі выбітных майстроў беларускага слова (Р. Барадулін, У. Някляеў). Даведаюцца пра ўручэнне літаратурнай прэміі «Гліняны Вялес» Таварыства вольных літаратараў, а яшчэ — пра заснаванне часопісам «ПрайдзіСвет» першай штогадовай прэміі для беларускіх перакладчыкаў. Гэткім чынам, відавочная зарыентаванасць **«НН»** на нацыянальны кантэкст ды спроба прытрымлівацца календара літаратурных і культурніцкіх падзеяў. Аднак тут прасочваецца адсутнасць хоць якога сістэмнага падыходу да асвятлення кінематаграфічных і літаратурных навінак.

**«Беларусь сегодня»**, у сваю чаргу, хоць і часткова арыентаваная на нацыянальны літаратурны кантэкст (вышэйзгаданыя «Янкаў вянок», «Анёлак і я», «Я хацеў бы спаткацца з вамі»), аднак «правінцыялізуе» яго, засяроджваючы сваю ўвагу на замежнай, у тым ліку расійскай, літаратуры. Выданне практычна не карыстаецца роднай мовай. Нават у рубрыцы з назвай «Што ні край, то звычай» не адшукаеш ніводнага артыкула на беларускай мове!

Адна з адметнасцяў калялітаратурных успамінаў, што друкуе газета, — «настальжы». Перагортваеш старонкі — і такое ўражанне, што перанёсся на колькі дзесяткаў гадоў назад: усхліпы па мінулым Э. Язерскай і па яе «шоп-шуб-турах», нейкія шэравата-прэснаватыя, больш падобныя да дзённікаў, аповеды Б. Вайханскага... Шмат увагі надаецца пустым падзеям, не адчуваецца руху,

# СБ

нават неназіраецца пошуку новых арыгінальных падыходаў у той жа стылістыцы. Часам падаецца, што некаторыя тэксты быццам бы скалькаваныя: змяняецца толькі аб'ект гутаркі, а астатняе аднолькава прадказальна. Дэвіз — у нас усё добра і стабільна — гучыць паміж радкамі.

Паспрабуем параўноўваць далей. Якія постаці і падзеі з'яўляюцца арыенцірамі для інтэрнэт-версіяў выданняў? Дзіўна, але, нягледзячы на штодзённы наклад **«СБ»**, тэксты, звязаныя з гісторыяй краіны, зусім нячаста з'яўляюцца на яе старонках. Затое вы даведаецеся, што нашыя цырульнікі сталі абсалютнымі чэмпіёнамі краін Усходняй Еўропы, што лідэр «Лепрыконсаў» І. Міцько робіць нейкі «бэст» і што «3+2» зусім не пяць, як вучылі ў школе, а «сімпатычны квінтэт», які будзе ўдзельнічаць у конкурсе «Еўрабачанне-2010». Галава кругам ідзе ад розных «суперцікавых» навінаў: Іна Афанасьева пакрыўдзілася на інтэрнет, экс-«Топлес» Ганна Гоманава спявала, спявала і раптам замалявала, Віталь Артыст «рвется к солнцу», Ніна Багданава «утопает в шелках», а «Шуба — не роскошь, а средство передвижения» (для каго б вы думалі, дагадайцеся з трох разоў!). Дык усё ж, на якую аўдыторыю скіраваная газета? І не назавеш яе жоўтай. Здаецца, каб утрымаць непераборлівага чытача, рэдактары патураюць папсовым густам большасці. Жыццё ў Беларусі, паводле версіі **«СБ»**, выглядае як глянцавая вокладка гламурнага часопіса.

Гартаем далей. А вось «Кто ищет, тот найдет!» — артыкул І. Завадскай, у якім ідзе гаворка пра пошукі Нацыянальным мастацкім музеем каштоўнасцей, страчаных падчас Другой сусветнай вайны. Музей прэзентуе новы мультымедыйны дыск з архівамі за ўсю гісторыю свайго існавання. Аб магчымым адраджэнні беларускага гістарычна-этнаграфічнага музея ў Вільні піша В. Корбут у сваёй зацемцы «Музейные версии». Увогуле ўражваюць назвы... «Изведал враг в тот день не мало...» — распавядае В. Казловіч аб калекцыі Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея. «Оглянуться, чтобы увидеть будущее» — нарыс Г. Уліцёнак аб выставе старадаўніх паштовак і фотаздымкаў у музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Чытаеш — і неяк няўтульна становіцца пасля пасажаў кшталту: «*Не может не ужасать снимок пылающей белорусской деревни, где вырисовываются фигуры гитлеровцев, любующихся своим черным делом. И это надо видеть, чтобы родную историю не только познавать умом, но и прочувствовать сердцем*». Уражанне, што артыкул выдраны з газеты пасляваеннага часу. І гэта менавіта зараз, калі вядзецца шмат палемікі на гэтую складаную тэму...

Пра Полацк і мерапрыемствы па абнаўленні аб'ектаў, якія ўваходзяць у спіс культурніцкай спадчыны Полаччыны, распавядае В. Пепяляеў у сваім артыкуле «Культурная ставка». Чытач даведаецца, што ў межах святкавання міжнароднага дня роднай мовы, заснаванага ЮНЕСКА, у Полацку сёлета адбыўся фолькавы фэст «Полацкі сшытак».

У аглядах журналістаў **«СБ»** падрабязнасцяў небагата — відавочна, што аўтары матэрыялаў не часта бываюць на месцы падзеяў, таму інфармацыя падаецца імі павярхоўна.

Сустракаюцца часам і цікавыя даследаванні. Напрыклад, Л. Рублеўская і В. Скалабан у сумесным артыкуле «Особенности защиты диссертаций недавнего времени» распавялі пра рассакрэчаныя дакументы 1930–40-х гадоў, калі літаратуразнаўцы Беларусі пераследаваліся не толькі за погляды і паўсюль адчуваўся подых даносаў і зайздрасці.

За той жа перыяд у **«Нашай ніве»** значна болей артыкулаў, прысвечаных беларускай гісторыі. Шмат публікацыяў гісторыкаў з Літвы і Польшчы. На форумах чытачы абмяркоўваюць неабходнасць рэстаўрацыі Наваградскага, Мірскага, Нясвіжскага замкаў, іншых помнікаў, удзельнічаюць у жыцці газеты, дасылаюць свае матэрыялы, прапаноўваюць тэмы для дыскусій. Аўтарытэтна гучаць прозвішчы Сапегаў і Радзівілаў, Каліноўскага і Орды, Багушэвіча і Купалы, Гарэцкага і Караткевіча, Быкава і Барадуліна.

Аналізуючы культурніцкія падзеі паводле версій гэтых дзвюх інтэрнэт-газет, я заўважыла, што не так і часта можна прачытаць сапраўды цікавыя матэрыялы. Нярэдка ж маем справу з пэўнай заангажаванасцю ды спецыфічным падборам анансаваных тэкстаў, фільмаў і падзеяў. Да таго ж у кожнай газеце — свая «праўда», свая культура, свой Мінск і свой Менск і, нарэшце, свая родная мова, у адным выпадку беларуская, а ў другім — расейская.

# Секс
# и творчество



*Анастасия Зеленкова*

**Если верить дедушке Фрейду, творчество — это сублимация либидо, то есть, по-простому, творчество определено сексуальностью. Так ли это? Действительно ли творческие люди отличаются в этом отношении от «нормальных» и влияет ли хоть как-то вообще одно на другое?**

## Большие гиганты большого секса

Существует высказывание: не всякий половой гигант — гений, но среди гениев очень велик процент половых гигантов.

Подтверждение можно найти в глубокой античности. Например, древнегреческая поэтесса Сапфо. Даже ее современники называли Сапфо не иначе как «сладострастной нимфоманкой». Впрочем, и на творческой ниве поэтесса трудилась не менее плодотворно, оставив после себя бесчисленное множество стихов, большинство которых с приходом христианства были уничтожены ее менее сексуально активными коллегами.

Хватает примеров и посвежее. Существует история о том, как Тургенев однажды зашел в гости к Дюма и обнаружил того за написанием очередного романа, в то время как на коленях у писателя шалила полуобнаженная девица.

«Александр, а она не мешает тебе работать?» — поинтересовался Тургенев.

«Отнюдь, — жизнерадостно отвечал Дюма. — Если бы на втором колене у меня сидела вторая такая же, я бы работал в два раза быстрее».

Неизвестно, был ли такой диалог в реальности, но то, что Александр Дюма не пропускал ни одной юбки — факт исторически доказанный. Дотошные биографы даже подсчитали, что у создателя «Трех мушкетеров» было как минимум 500 любовниц (кстати, и 647 произведений). «Много любовниц я завожу из человеколюбия; если бы у меня была одна любовница, то она умерла бы через неделю», — оправдывался Дюма.

По стопам Дюма (творческим и эротическим) шествовал его соотечественник Оноре де Бальзак. «Любовь — единственная страсть, не признающая ни прошлого, ни будущего», — утверждал Бальзак и отдавался этой страсти вновь и вновь. Причем, как известно, юные красавицы, которые слишком много требовали и слишком малым вознаграждали, писателя не сильно привлекали. «Сорокалетняя женщина сделает для тебя все, двадцатилетняя — ничего», — с видом знатока утверждал он, заводя очередной зрелый роман.

Бог сполна одарил и одного из самых гениальных художников нашей современности Пабло Пикассо, известного всему миру не только своими живописными полотнами, но и множеством романтических отношений с представительницами прекрасного пола. Одни романы были быстротечными, другие более продолжительными. Но



*Сапфо, фреска в Помпеях*



*Пабло Пикассо.*
***Женщины, бегущие по берегу.***
*1922 г.*

все в той или иной степени оказали влияние на творчество живописца.

Да и великий физик Ландау, по воспоминаниям очевидцев, не пропускал ни одной юбки. И набирал сотрудниц исключительно по принципу сексуальной привлекательности, справедливо полагая, что по сравнению с ним все равно в физике все остальные — профаны.

Что уж говорить о душе российской поэзии Александре Сергеевиче Пушкине, который при всей своей необычайной романтичности редко отказывался от плотских удовольствий. «Для учета» Пушкин даже записал имена своих пассий (видно, чтобы не забыть ввиду огромного их количества). Донжуанский список из одних только имен и цифр был оставлен Пушкиным в альбоме сестер Ушаковых и, по мнению ученых, представляет собой перечень всех женщин, которыми увлекался поэт. К слову, свою жену Наталью Гончарову Александр Сергеевич в письме к В. Ф. Вяземской окрестил не иначе как «моя сто тринадцатая любовь». Ай да Пушкин!..

Белорусская история тоже знает немало подобных примеров. Так, огромное количество произведений на любовную тему оставил после себя поэт XVI века Ян Кохановский. Судя по текстам, знал он предмет своего творчества не понаслышке. Не отстает и поэтесса и драматург XVIII века Франтишка Уршуля Радзивилл. Любительница арабских сказок «Тысяча и одна ночь» (их она часто брала за основу своих произведений), Уршуля, несмотря на частое отсутствие супруга Михала Казимира Рыбоньки, умудрилась забеременеть 34 (!) раза. Что поделать, контрацепция в те времена была несовершенна.

Дошли до нас также эротическая переписка Яна Собеского с его женой Марысенькой, дневник Саломеи Пильштыновой «Авантюры моей жизни» и другие далеко не пуританские произведения, свидетельствующие о широких взглядах их авторов. Хотя в целом надо признать: эротическая составляющая жизни наших славных соотечественников еще требует серьезного изучения.

Что же касается научных исследований в этой области, то специалисты из английского Университета Ньюкастл подсчитали, что профессиональные художники и поэты за свою жизнь имеют в два раза больше сексуальных партнеров, чем «нормальные» люди. Причем более маститые творцы, по сравнению со своими начинающими собратьями, могут похвастаться и большим числом эротических приключений.

С наукой не поспоришь. Тем более что примеров — хоть отбавляй: Леонардо да Винчи, Байрон, Шекспир, Бернс, Некрасов, Толстой, Достоевский, Бунин, Блок... А великий Чингисхан вообще умер во время занятия сексом.

Однако есть и другая сторона медали.

## Они ничего не знали «про это»

Как оказалось, среди людей великих и неоспоримо талантливых есть и те, кто всю свою энергию предпочел направлять исключительно в



***Пушкин в образе монаха, искушаемого бесом. Подпись: «Не искушай(сай) меня без нужды». Автопортрет, помещенный в альбоме Ушаковых сразу после донжуанского списка Пушкина***



***Николай Васильевич Гоголь утверждал, что отношение к половой любви у него «экзистенциальное»***

творческое русло. Среди них, например, Николай Васильевич Гоголь. Еще ничего не зная об учении Фрейда, который утверждал, что, если сексуальная энергия не находит себе выхода непосредственно в сексе, то преобразуется в творческую, Гоголь стал наглядным подтверждением этой теории. Современные исследователи считают, что писатель за всю свою жизнь так ни разу и не познал женской любви. По свидетельству врача, который ухаживал за Гоголем перед смертью, «сношений с женщинами он давно не имел (скорее всего, не имел вовсе). И признавался, что не чувствовал в этом потребности и никогда не ощущал от этого особого удовольствия». Последнее замечание, правда, еще позволяет усомниться в полной невинности писателя, однако ясно, что секс в его жизни не играл никакой роли. Впрочем, сам Гоголь по этому поводу мало переживал и не раз подтверждал, что отношение к половой любви у него «экзистенциальное».

В этой своей воздержанности Гоголь был не одинок. Знаменитый сказочник Ганс Христиан Андерсен также может считаться одним из самых известных девственников в литературе. Дело в том, что внешность Андерсена отнюдь не соответствовала канонам красоты: это был высокий, даже долговязый человек с глубоко посаженными глазами и большим носом, к тому же страшно застенчивый. Доподлинно известно, что он любил трех женщин: Риборг Войт, сестру своего одноклассника, Луизу Коллин, дочь одного из меценатов-благодетелей, и певицу Йенни Линд. Но ни с одной из них роман не состоялся, как, впрочем, и ни с какой другой женщиной на свете, о чем можно судить по переписке самого Андерсена. По мнению исследователей, он так и умер девственником, дожив до 70 лет.

Известный немецкий философ Иммануил Кант прожил еще дольше — до 80 лет, но тоже предпочел женщинам любимое занятие. Не познал радостей секса и Исаак Ньютон, в чем сам признался на смертном одре. Не известно, можно ли приписать его математический гений сексуальной неудовлетворенности, зато можно догадаться, почему он страдал бессонницей.



***Иммануил Кант предпочел философию женщинам***



***Математический гений Исаака Ньютона, возможно, был связан с отсутствием радостей секса***



***Ганс Христиан Андерсен никогда не пользовался благосклонностью женщин***

В белорусской истории я таких примеров самоотверженности не обнаружила (не считая, конечно, монахов-просветителей). Зато отыскала множество подтверждений тому, что эротическая тема нашла выход в произведениях изобразительного искусства и литературы.

## Голое искусство

Оказалось, что еще с глубокой древности наши предки активно использовали эротические мотивы в своих произведениях. Поныне археологи продолжают находить на территории Беларуси фаллосы разнообразных форм и размеров, изготовленные из всевозможных природных материалов. Про такие эротичные «приветы» из прошлого рассказывает писатель и историк Владимир Орлов в книге «Таямніцы полацкай гісторыі». В частности, он упоминает деревню Дорохи (Городокский район) — территорию, некогда заселенную полочанами. Около деревни поныне находят многочисленные фаллосы из темно-серого песковика. Самая большая из таких находок достигала



*Даже в известном всем Шкловском идоле ученые узрели фаллический символ*



*Деревянный идол, найденный в Бешенковичском районе, близ Осовца*



*Мечта поэта — каменная баба*

в длину 80 сантиметров. Не удивительно, что нынешние жители этой деревни стесняются послать приезжего в соседний лес, который окрестили на манер «хваёвага», но с учетом специфики найденного там материала.

О многочисленных камнях фаллической формы писал в первом издании своей «Истории русской церкви» белорусский академик Николай Никольский. Кстати, даже в знакомом всем по школьным учебникам Шкловском идоле исследователи видят все тот же фаллический знак. А многочисленные другие языческие изваяния не позволяют даже усомниться в первоначальном замысле древних мастеров.

Но не стоит думать, что наши предки стали открывателями в этом деле. И древнеиндийский Шива, и египетский Осирис отображались в виде огромного фаллоса, а в самом известном святилище Эрота, которое находилось в Феспиях, беатийцы представили божество в виде простого фаллического столба. Для языческого мировосприятия была естественной параллель между центральным богом и мужским детородным органом.

Однако восстановим гендерную справедливость и припомним известных всем каменных баб. Только в Беларуси таких скульптур было найдено около десятка. Конечно, можно поспорить насчет эротичности этих обнаженных красавиц: гипертрофированные бедра и дородные фигуры не очень соответствуют современному идеалу женской привлекательности. Однако не будем забывать, что наши предшественники подходили к вопросам секса прагматично и в женщинах в первую очередь ценили их способность к деторождению. И такая вот «баба» — самое лучшее, что только можно пожелать для устойчивого продолжения рода!

Исследователи еще продолжают спорить, откуда взялись они на нашей земле и каких ритуалов требовали, но факт остается фактом: «бабам» тут нашлось применение.

Даже с приходом христианства тема эротики не была заброшена белорусскими творцами. Достаточно взглянуть на летописи. Например, миниатюры знаменитой Радзивилловской летописи



*Так художник отобразил дарование киевским князем Ярополком переяславского княженья своему брату Андрею и волынского — племяннику Изяславу Мстиславовичу. Слева — «аллегорическая фигура»*

(памятник 1490-х гг.) подчас впечатляют своим натурализмом.

Наиболее богатыми на эротику могут считаться, пожалуй, XVI–XVII века. Ренессансное мышление, которое в те времена захватило всю Европу, не обошло и наши земли. Пока где-то в Италии Микеланджело и Леонардо да Винчи рисовали своих мадонн, в Беларуси наш знаменитый первопечатник Франциск Скорина размещал обнаженные тела на гравюрах к Библии.

«Дело Скорины», в том числе и на эротической ниве, было продолжено в Брестской (Радзивилловской) Библии 1563 года, которая вышла в типографии, основанной Николаем Радзивиллом Черным в Бресте. Эротичные образы присутствовали даже в таких произведениях искусства, которые, казалось бы, не предусматривали сексуальных мотивов. Например, в парадных портретах. Или в «Дипломатическом кодексе», который был напечатан в 1758 году в виленской пиарской типографии.

Что до собственно эротических рисунков — а они, безусловно, тоже были, — то, к сожалению, многие из них канули в Лету. Небольшие миниатюры (обычно анонимные) зачастую были неприличного характера и особой изысканностью не отличались. А потому и про сохранение этих «шедевров» не сильно пеклись. Хотя, возможно, истоки древнебелорусского «Плейбоя» можно еще поискать в литовских и польских архивах. Думается, завалялась в музейных подвалах и пара-тройка эротических полотен живописцев XIX века, которые окончательно развеют миф о пуританстве белорусов.

Что уж говорить о художниках начала XX столетия, «обнаженные» картины которых сегодня украшают лучшие музеи мира! Так, страсть к рисованию обнаженного тела наглядно демонстрировал всемирно известный Марк Шагал. Ошибается тот, кто думает, что знаменитый супрематист Малевич восхищался исключительно квадратами и разными другими геометрическими формами. Раннее творчество художника свидетельствует, что ничто человеческое Малевичу не было чуждо. Хотя, может, и в более поздний период мастер «баловался обнаженкой», шифруя ее в свои черные, белые и красные квадраты?

В общем, как видим, строгость и невинность художественного видения — это не про наших именитых земляков, которые, некогда активно вкалывая на эротической ниве, протоптали дорожку современным творцам.



*Марк Шагал. Красная обнаженная. 1908 г.*



*Казимир Малевич. Купальщики. 1930 г.*




*Фрагменты титульного листа Радзивилловской Библии 1563 г.*



*Фрагмент оформления «Дипломатического кодекса», напечатанного в виленской пиарской типографии в 1758 г. Ну чем не Рубенс?*

# О великих делах великих людей

*Теперь же обратимся к великим людям современности: любопытно узнать, что думают на этот счет знакомые творческие люди. Правдивы ли рассказы об их гиперсексуальности, и как они используют секс в своей работе?*

*Одни, услышав тему разговора, нервно хихикали, другие сразу же предлагали перейти к практическим занятиям, третьи вообще напрочь отказывались это обсуждать (видно, из скромности). Но, как бы там ни было, все были солидарны: секс и творчество — понятия неразделимые.*

**Зміцер Вайцюшкевіч, музыкант: *«Хаця, бывае, хочацца падысці пасля канцэрта і сказаць ёй: «Пайшлі!»***



— Я спадзяюся, што адно на адно ўплывае. Але скажу, што я не карыстаюся творчасцю дзеля сексу. Я не падыходжу пасля канцэрту да дзяўчат і не прапаноўваю ім інтымных зносін, бо лічу, што гэта няправільна... *(Пасля некаторай паўзы)* Хаця часам бывае — хочацца падысці і сказаць: «Пайшлі!»

Наадварот таксама не здараецца: не такі я, напэўна, артыст, да якога могуць падысці і прапанаваць сябе. А можа, і прапануюць — толькі ў нейкіх іншых формах? Мужыкі ж — яны тупаватыя, могуць толькі на дзесятыя суткі зразумець. Ой, напэўна, і былі такія сігналы.

Я б не стаў замяняць адно другім. Трэба шукаць магчымасці спалучаць і знаходзіць месца для ўсяго. Але ўсе сакрэты я вам расказваць не буду. Ці стымулюе мяне адсутнасць сексу да большай творчасці? А я проста стараюся не дапускаць гэтай адсутнасці.

**Петр Марцев, редактор «БДГ»: *«Меньше слов — больше дела!»***



— Эмоциональный всплеск, когда чувства бьют через край, естественно, стимулирует работоспособность. Но теория Фрейда все же не абсолютна. Для меня одно другого не исключает. По моему мнению, нельзя полностью заменить секс творчеством. Лично я никогда не пытался это сделать. Наоборот, для меня одно является логическим продолжением другого. Секс только способствует творческому процессу. Сами попробуйте. И меньше слов — больше дела!

**Елена Адамчик, фотохудожник: *«От одного творчества ребенок не рождается»***



— Эротика — это необходимый элемент в искусстве. Я кандидат биологических наук, поэтому для меня и секс — это творческий момент. Он дает жизнь новому поколению, оправдывает существование животного, человека на этой земле. Возможно, секс не всегда процесс творческий, но, с другой стороны, и от одного творчества ребенок не рождается.

Меня, конечно, больше окружают творческие люди. И я не делю их на сексуальных или гиперсексуальных. Для меня не существует такого критерия. Не всегда количество переходит в качество.

Кстати, одним из величайших мужчин для меня является Казанова. Это великий человек, мыслитель. Очень однобоко воспринимать его просто как сексуальную машину. А что Фрейд? Фрейд — просто доктор. И то, что он говорил о сексе, не имеет такого глубинного значения, какое имеют литература или искусство. И вообще, на мой взгляд, к творчеству понятия сексуальность или гиперсексуальность не совсем применимы. Сейчас все говорят про сексуальность. Но от этого творческих людей больше не становится. Я предпочитаю великих и творческих.



**Аляксей Марачкін, мастак: *«Я не ведаю, што стварылі еўнухі ў мастацтве»***

— Нават у Бібліі сказана, што сексуальны мужчына — соль зямлі. Так, мы ад граху, мы грэшныя, але ўсё гэта ад Бога. Бо што такое секс? Гэта прыродная з'ява, тое, што злучае і цягне нас адно да аднаго. Таму калі ёсць сексуальная энергія, то ёсць і творчая. А калі няма, — наўрад ці што атрымаецца. І ў літаратуры, і ў музыцы лепшыя творы напісаны на эмацыйным сексуальным уздыме. Калі гэтая энергія знікае, чалавек становіцца пасіўным, нецікавым сам для сябе. Я не ведаю, што стварылі еўнухі ў мастацтве.

Так, былі людзі, якія наўмысна абмяжоўвалі сябе ў сексе, як пустэльнікі ішлі ў пячоры і там тварылі, але гэта хутчэй выключэнне. Ці, можа, вышэйшая ступень творчасці? Я на такія подзвігі, канешне, не ішоў. Але магу сказаць, што для творчасці трэба быць паяднаным са сваім духам. Хаця… адначасова і тым і тым займацца цяжка. Але ж геніяльны твор Рэмбранта «Аўтапартрэт з Саскіяй на каленях» шмат пра што гаворыць.

Дарэчы, вы якраз заспелі мяне падчас працы. Малюю карціну. На ёй жбаночак, кветачкі і курыныя яйкі. Тут ёсць патаемны сэнс. Вось яно, жыццё, вось яно, паяднанне аднаго з другім.

# Запрашае школа маладых журналістаў

## *Марыш паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы?*

## *Прыходзь у Школу маладога журналіста — 14!*

Тут ты атрымаеш веды і ўменні ад прафесійных выкладчыкаў, пазнаёмішся з цікавымі людзьмі і па-новаму зірнеш на жыццё!

Школа маладога журналіста — гэта 7-месячныя курсы, якія складаюцца з тэарэтычнага і практычнага блокаў. Тэарэтычная частка прысвечаная асновам журналістыкі («Уводзіны ў журналістыку», «Прававыя і этычныя аспекты працы журналіста», «Жанры журналістыкі», «Асаблівасці газетнай, радыё- і інтэрнет-журналістыкі» і інш.).

Практыку навучэнцы праходзяць у рэдакцыі інтэрнет-газеты і радыё «Твой стыль», а таксама ў відэарэдакцыі.

Выкладчыкі і трэнеры — прафесійныя журналісты беларускіх і замежных сродкаў масавай інфармацыі, а таксама псіхолагі, юрысты, філолагі. Праект «Школа маладога журналіста» (ШМЖ) існуе з 1997 года. За 13 гадоў ШМЖ прайшло больш за 270 хлопцаў і дзяўчат. Выпускнікі ШМЖ працуюць сёння ў газетах «Вечерний Гродно», «Гродзенская праўда», «Перспектива», «Наша Ніва», «Белорусы и Рынок», на тэлеканале АНТ, а таксама ў замежных СМІ.

Да ўдзелу ў праекце «Школа маладога журналіста — 14» запрашаюцца гарадзенскія юнакі і дзяўчаты ад 16 да 25 гадоў.

Заявы на ўдзел прымаюцца з 16 жніўня да 15 верасня па адрасе:
г. Гродна, вул. Будзённага, 48а — 11, з 12:00 да 17:00 (акрамя суботы і нядзелі).

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць па тэлефонах:
8 (0152) 75 71 72;
8 (029) 7 830 845.


КРАЇНА
ГОТЕЛЬ
HOTEL